

# У МІНСКАЙ І ГРОДЗЕНСКАЙ АБЛАСЦЯХ І Ў МІНІСТЭРСТВЕ ЭНЕРГЕТЫКІ — НОВЫЯ КІРАЎНІКІ

**Падрабязнасці кадравага дня ў Прэзідэнта**

(Працяг на стар. 2-3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 КРАСАВІКА 2025 г. АЎТОРАК № 63 (30451)

ГОД ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ

## ЗЯЛЁНАЯ СПАДЧЫНА ЎНУКАМ

**Рэспубліканская акцыя «Дай лесу новае жыццё!» набірае абароты**

Зялёнаму багаццю ў нашай краіне аддаецца асаблівая ўвага з боку дзяржавы. «Лес ёсць лес. Амаль палова краіны — гэта лес. Гэта наш здабытак, дадзены нам Богам», — казаў Прэзідэнт Беларусі, падкрэсліваючы неабходнасць гаспадарскага стаўлення да гэтага рэсурсу. Летась, падчас знаёмства з ходам работ па ўстараненні наступстваў стыхіі ў Мазырскім раёне Гомельскай вобласці, кіраўнік дзяржавы даў даручэнне апаратыўна заняцца лесааднаўленнем і прыцягнуць да гэтага ў тым ліку насельніцтва, працоўныя калектывы, студэнтаў. «Мы павінны за будучы год усё гэта аднавіць, — паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка. — Трэба парадак навесці».

СТАР. 8



Фота БелТА.



Фота «Гомельщина официально».







Фота «Витебские вести».

ЯК ЗАХОЎВАЦЬ ГРОШЫ?

10-11



САКРЭТЫ І ЗНАХОДКІ МЕНКІ

13



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25063>

СПОРТ-ТАЙМ

## АРЫНА САБАЛЕНКА ЗАМАЦАВАЛА СТАТУС ПЕРШАЙ РАКЕТКІ СВЕТУ

**У традыцыйным аглядзе «Звязды» — добрыя спартыўныя навіны**

**ПЕРАМОГА ТЫДНЯ.** Беларуская тэнісістка Арына Сабаленка ўпершыню ў кар'еры выйграла турнір катэгорыі WTA-1000 у амерыканскім Маямі з прызавым фондам 8,9 мільёна долараў. У вырашальным паядынку першая ракетка планеты перамагла амерыканскую тэнісістку Джэсіку Пегулу з лікам 7:5, 6:2. Сустрэча працягвалася 1 гадзіну 29 хвілін.

***З перамогай Арыну Сабаленка павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «Моцнай, стабільнай і прыгожай гульнёй ты чарговы раз пацвердзіла сваё лідарства ў жаночым сусветным тэнісе. Ганарымся тваімі поспехамі і заўсёды балеем за цябе. Жадаю табе моцнага здароўя і новых дасягненняў», — гаворыцца ў віншаванні беларускага лідара.***

Пасля перамогі ў Маямі Арына Сабаленка замацавала статус першай ракеткі свету. У рэйтынгу WTA яна больш чым на тры тысячы ачкоў апярэджвае польскую тэнісістку Ігу Свёнтак, якая займае другі радок.



СТАР. 14

# «НАША ЖЫЦЦЁ — НІШТО Ў ПАРАЎНАННІ З ТЫМ, ДЛЯ КРАІНЫ І ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ»

Новы рабочы тыдзень краіна пачала з двума новымі старшынямі аблвыканкамаў і адным міністрам. Адпаведныя кадравыя рашэнні прыняў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Людзі кампетэнтныя, на дзяржаўнай службе не адзін год, сваю справу ведаюць. Таму кіраўніку дзяржавы не прыйшлося залішне настройваць іх на працу і падрабязна ўводзіць у курс спраў — ён толькі актуалізаваў задачы.



Фота БелТА.

## ПЛАНКУ ЗНІЖАЦЬ НЕЛЬГА — ПАКАЗЧЫКІ ТРЭБА ВЫКОНВАЦЬ

Старшынёй Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта прызначаны Юрый Караеў. Рэгіён знаёмы: больш за чатыры гады ён працаваў памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па гэтай вобласці. Таму Аляксандр Лукашэнка адразу акрэсліў канкрэтныя задачы і праблемы, на якія новаму кіраўніку заходняга рэгіёна трэба звярнуць самую пільную ўвагу. У прыватнасці, не выконваюцца некаторыя прагнозныя паказчыкі. «За студзень-люты, гэта значыць за гэтыя два месяцы, два паказчыкі не выкананы. Валавы рэгіянальны прадукт — 2 % не дацягнулі да ста. А ўвогуле 5 % да планавых паказчыкаў Гродзенская вобласць не дацягнула. І вытворчасць прадукцыі сельскай гаспадаркі — вы недзе пад працэнт не дадалі», — заўважыў Прэзідэнт. — Я, канешне, разумею, што ўзровень сельскай гаспадаркі ў рэгіёне вельмі высокі і дадаваць да гэтага складаней, чым у іншых абласцях. Гэта зразумела. Але паказчыкі трэба выконваць, і вы як чалавек ваенны гэта лепш за ўсіх разумееце». Аляксандр Лукашэнка таксама заўважыў, што на Гродзеншчыне скарачаецца колькасць занятых у эканоміцы, што ўласціва і іншым рэгіёнам. «Гэта дрэнна, але, магчыма, вы і такой колькасцю спраўляецеся», — сказаў беларускі лідар.

Паказчык тэмпу росту будаўніча-мантажных работ у вобласці за 2024 год не выконваецца больш як на 17 працэнтаў. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта адзіны рэгіён, які не забяспечыў дадзены паказчык. «Пастаўлена задача штогод з 2025-га забяспечваць валавы збор у вас збожжавых, зернебабовых, кукурузы 2,5 мільёна тон. Тут хоць памры, але такога паказчыка трэба дасягнуць», — паставіў задачу Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу на вечную праблему — падзеж буйной рагатай жывёлы, які на 11 % вышэйшы за ўзровень 2023 года. «За што за што, а за падзеж жывёл спытаем найжорстка і з іншых, і з вашай вобласці. У іншых яшчэ больш сумна», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што лягчэй у Гродзенскай вобласці не будзе. Нават нягледзячы на тое, што гэта найбольш развітая вобласць. Па яго словах, там прамысловасці не столькі, як у іншых рэгіёнах, хоць з увядзеннем атамнай станцыі дадалося. Але сельская гаспадарка, нагадаў Прэзідэнт, — гэта жытніца краіны. «Мы заўсёды ў прыклад ставілі Гродзенскую вобласць, называючы яе жамчужынай. Людзі працавітыя, людзі добрыя, вас паважаюць, я ведаю гэта. І вы неяк прыжыліся там, як на сваёй роднай зямлі, мяне гэта радуе. Парадак і дысцыпліну вы трымаеце там. Вы ведаеце, што без дысцыпліны і парадку, без тэхналагічнай дысцыпліны мы наўрад ці нешта ў Гродзенскай вобласці зможам зрабіць», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да кіраўніка рэгіёна.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ведае Юрыя Караева як чалавека адказнага і дысцыплінаванага. «Калі трэба, значыць, трэба. Гэта павінна быць зроблена, і вы можаце гэта зрабіць. Таму з шэрагу кандыдатур, якія прапанаваліся па Гродзенскай вобласці, я прыняў рашэнне прызначыць вас губернатарам Гродзенскай вобласці. Натуральна, дэпутаты абласнога Савета вас там яшчэ патузаюць. Але яны пра вас добрага меркавання і мяне гэта радуе. Мяне яшчэ задавальняе, што вы чалавек ваенны. Сітуацыя на заходніх граніцах — лепш за мяне ведаеце, што там адбываецца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што ваенныя рысы характару Юрыя Караева, той факт, што ён асвоіў сельскую гаспадарку, і добрая школа на пасадзе памочніка Прэзідэнта дапамогуць яму ў кіраванні рэгіёнам. Таксама, па словах кіраўніка дзяржавы, добрай падмогай для губернатара будуць і кваліфікаваныя аграрыі, якія працуюць у вобласці. У прыватнасці, кіраўнік дзяржавы вылучыў першага намесніка старшыні аблвыканкама Юрыя Валяватага, прафесіянала аграрнай справы: «Ён вам будзе добрай апорай і памочнікам».

«У вас вельмі добрыя арганізатарскія здольнасці. Гэта таксама добра. Таму пры ўсіх недахопах (а яны ва ўсіх ёсць) трэба сказаць, што ў вас дастаткова добры крэн у станоўчы бок. І вельмі спадзяюся, што губернатарам вы там спрацуеце, — падсумаваў беларускі лідар. — Гэты досвед будзе вельмі важны ў далейшым. Ваенныя людзі зусім маладымі ідуць на пенсію, можа, яны дапамогуць нам і ў народнай гаспадарцы. Таму за вамі будучыня».

* * *



У размове з журналістамі Юрый Караеў падкрэсліў, што зададзеную планку Гродзенскай вобласці як жамчужыны Беларусі ні ў якім разе зніжаць нельга, трэба шукаць пункты росту і павялічваць паказчыкі. А для гэтага, па яго словах, трэба рэалізоўваць у вобласці новыя прарыўныя праекты, каб затрымліваць людзей у рэгіёне. «Як прыклад — Астравец: высокая зарплата на высокатэхналагічнай вытворчасці з усёй інфраструктурай. Гэта дапамагае ўтрымаць людзей у раёнах, і трэба да гэтага імкнуцца», — адзначыў губернатар. Юрый Караеў расказаў, што яго былая пасада памочніка Прэзідэнта ў рэгіёне мела на ўвазе актыўную работу з кадрамі. «Кадры я ведаю нядрэнна. І кіраўніком дзяржавы было адзначана, і я гэта пацвярджаю, што

# СВЯДОМЫ ВЫБАР

## Сацапытанне: абсалютная большасць беларусаў задаволены вынікамі прэзідэнцкіх выбараў

Абсалютная большасць беларусаў задаволены вынікамі прэзідэнцкіх выбараў. Такія даныя сацыялагічнага даследавання агучыла загадчыца кафедры эканамічнай сацыялогіі і псіхалогіі прадпрымальніцкай дзейнасці, кіраўнік Цэнтра сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ Ірына ЛАШУК.

У лютым 2025 года цэнтрам сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ праведзена сацыялагічнае апытанне «Постэлектаральныя настроі грамадства» ў форме інтэрв'ю грамадзян па месцы іх пражывання (па метадыцы «твар у твар»). У ім прынялі ўдзел 1,5 тысячы паўналетніх беларусаў з розных рэгіёнаў краіны.

Па выніках аналізу апытання адзначаецца пазітыўны ўзровень успрымання большасцю насельніцтва вынікаў выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія адбыліся 26 студзеня 2025 года. Вынікамі задаволены 90,4 % апытаных. Не змаглі вызначыцца з адказам — 8,2 %, не задаволены — 1,4 %.

— Зразумела, што вынікі выбараў мы ўжо ведаем. Але сацыялагічнае суправаджэнне заключаецца ў тым, каб даведацца, што людзі думаюць пасля выбараў, — адзначыла Ірына Лашук. — 90,4 % апытаных задаволены вынікамі прэзідэнцкіх выбараў. Гэта вельмі добры працэнт, які блізкі да вынікаў выбараў. Гэта сведчыць, па-першае, аб аб'ектыўнасці вынікаў. Па-другое, што беларусы сапраўды дэманструюць адзінства пазіцый. Яны выбралі таго, каго хацелі.

Не задаволены вынікамі 1,4 %.

— Гэта лічба настолькі малая. У сацыялогіі гэта лічыцца статыстычна нязначнай велічынёй. Яе можна наогул выключыць з аналізу. Не змаглі вызначыцца з адказам 8,2 % — таксама нязначная лічба, — патлумачыла Ірына Лашук. — Гэта значыць, пераважная большасць беларусаў задаволены вынікамі прэзідэнцкіх выбараў.

Рэспандэнтам таксама прапаноўвалася адказаць на пытанне: «Якія крытэрыі да кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь вызначалі ваш выбар?»

### ЦІ ЗАДАВОЛЕНЫ ВЫ ВЫНІКАМІ ПРЭЗІДЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ?




© Інфаграфіка БЕЛТА

Так, найбольш значныміназваны вопыт кіруючай дзейнасці (73,9 %), палітычныя перакананні (59,8 %), узровень адукацыі і кампетэнцый (40,3 %). Менш за ўсё ў сваім выбары выбаршчыкі арыентуюцца на наяўнасць заслуг або дасягненняў у кандыдатаў (34,8 %).

— Дастаткова аб'ектыўныя крытэрыі людзі ставяць на першыя месцы. Гэта кажа пра высокі ўзровень палітычнай культуры беларусаў, якія сёння

# ШТО МЫ ПАВІННЫ ЗРАБІЦЬ

## Які наказ Прэзідэнт даў новым губернатарам і міністру

вельмі моцная каманда прафесіяналаў склалася дзякуючы ўзважанай і дальнабачнай палітыцы Уладзіміра Сцяпанавіча Караніка, там традыцыйна моцныя кадры ў розных сферах. І мяняць нешта я пакуль не бачу патрэбы. Трэба ўзмацняць інфармацыйна-прапагандысцкі складнік, трэба ўзмацняць ідэалагічную работу», — падзяліўся планамі старшыня Гродзенскага аблвыканкама.

### ПАДТРЫМЛІВАЦЬ БУДЗЕМ, АЛЕ ПАТРЭБНЫ ВЫНІК

Старшынёй Мінскага абласнога выканаўчага камітэта прызначаны Аляксей Кушнарэнка. Да гэтага ён займаў пасаду міністра энергетыкі. У міністэрстве яго замяніў Дзяніс Мароз, які працаваў намеснікам міністра. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся меркаваннем Дзяніса Мароза накошт таго, ці справіцца яго былы начальнік з пасадай губернатара Мінскай вобласці. «Сумненняў у гэтым няма. Я нічога дрэннага сказаць пра Аляксея Іванавіча не магу. Добрага шмат што магу сказаць», — адказаў Дзяніс Мароз.

Галоўным недахопам Аляксея Кушнарэнкі Прэзідэнт назваў тое, што ён моцна перажывае за справу. «Дык які ж гэта недахоп? Гэта добрая якасць чалавека. Але, вядома, калі залішне парышся... Я не папракаю за гэта людзей, бо сам на гэта пакутую. Хочацца, каб ідэальна было, а ідэальна не атрымліваецца, тады пачынаеш думаць, можа быць, залішне. Але, тым не менш, мы жыццё павінны аддаць, наша жыццё — нішто ў параўнанні з тым, што мы павінны зрабіць для краіны і для людзей», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што хоча на прыкладзе Мінскай і Гродзенскай абласцей паглядзець, што атрымаецца з таго, калі вобласць узначаляць не аграрыі па спецыяльнасці. Аднак, заўважыў ён, Юрый Караеў за амаль пяць гадоў працы памочнікам Прэзідэнта сельскую гаспадарку спазнаў і палюбіў. Аграрны досвед ёсць і ў энергетыка Аляксея Кушнарэнкі. Цяпер у сістэме Міністэрства энергетыкі ёсць 15 сельскагаспадарчых філіялаў: «На сёння ў нас 86 тысяч буйной рагатай жывёлы. 3 іх 20 тысяч кароў. Што датычыцца зямель, 83 тысячы гектараў сельгасугоддзяў, 63 тысячы гектараў ворыва», — прывёў лічбы Аляксей Кушнарэнка.

Прэзідэнт згадаў эфектыўную гаспадарку «Газавік-Сіпакова». «Абласнога цэнтра ў вас няма, але ў вас ёсць буйныя гарады, у вас ёсць аграгарадкі, іх трэба проста прывесці ў парадак. Калі ў цябе ў Мінскай вобласці ўсе гаспадаркі будуць як «Газавік-Сіпакова», мне больш нічога не трэба. Вось трэба, каб былі такія гаспадаркі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён выказаў меркаванне, што работа з аграпрамысловым сектарам прыйдзецца па душы новаму кіраўніку Мінскай вобласці. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў гэтай сферы ёсць такая акалічнасць, як просьбы ўвайсці ў сітуацыю, пашкадаваць аграрыяў. «Так, мы будзем уваходзіць у сітуацыю аграрыяў і іх шкадаваць. Але патрэбен вынік. Гэта ж не справа, што скарачаецца колькасць, валавы збор трэба тры мільёны мець абавязкова. Рост падзяжу буйной рагатай жывёлы — куды ж гэтаварта? Вось я ўпэўнены, што ты гэтаму будзеш увагу аддаваць сур'ёзную», — звярнуўся да новага губернатара Аляксандр Лукашэнка.

Асобна кіраўнік дзяржавы спыніўся на практыцы аб'яднання і ўзбуйнення гаспадарак. Ён заўважыў, што часцей за ўсё гэта дае добра калі палову ад чаканага эфекту. Але ёсць і станоўчы досвед, калі гаспадаркі аддаюцца ў распараджэнне буйных прадпрыемстваў і арганізацый. «Калі моцныя — вось такія, як энергетыкі, прамысловыя прадпрыемствы, возьмуць гэтыя гаспадаркі, землі, я ўпэўнены, будзе вынік. Такі вопыт у Мінскай вобласці можна прымяняць. Тым больш у цябе ёсць гэты вопыт», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

* * *



«Скажу шчыра, для мяне гэта было вельмі вялікай нечаканасцю, улічваючы, што ўся мая прафесійная кар'ера звязана з работай у энергасістэме, дзе я прайшоў шлях ад майстра, маладога спецыяліста і літаральна каля сямі месяцаў таму стаў міністрам энергетыкі. Тым не менш няма часу на развагі. Калі Прэзідэнт гаворыць: «Трэба» — значыць, трэба. На новай пасадзе бачу для сябе магчымасць для рэалізацыі ўжо існуючых ведаў і вопыту», — падзяліўся Аляксей Кушнарэнка ў размове з журналістамі. Ён заўважыў, што Міністэрства энергетыкі — гэта шматпрофільная структура, у якой ёсць 15 сельскагаспадарчых філіялаў, прамысловыя прадпрыемствы, будаўнічыя арганізацыі, навуковыя, навучальныя ўстановы. «Таму ўпэўнены, што ўвесь існуючы вопыт дасць магчымасць эфектыўна працаваць на карысць Мінскай вобласці і ўсёй краіны ў цэлым. Прыярытэты кіраўніком дзяржавы расстаўлены — гэта пяцігодка якасці. І з ёмістым разуменнем якасці я ўсведамляю, што гэта якасць жыцця людзей. І прыкладу максімум намаганняў, каб узровень жыцця людзей рос», — адзначыў Аляксей Кушнарэнка. Сваёй асноўнай задачай ён назваў захаванне і памнажэнне дасягненняў папярэдняга кіраўніцтва Мінскай вобласці.

### КАБ ЭНЕРГАСІСТЭМА ПРАЦАВАЛА ЯК НАЛЕЖЫЦЬ

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што прызначэнне новага міністра энергетыкі — вельмі сур'ёзнае прызначэнне, і ўдакладніў, ці сапраўды Дзяніс Мароз справіцца з работай міністра. «Я не сумняваюся ў яго кампетэнцыях, магчымасцях, ведах і вопыце, якія дазволяць выбудаваць энергасістэму так, як яна павінна працаваць», — адказаў Аляксей Кушнарэнка за свайго былога намесніка. Ён запэўніў, што Дзяніс Мароз умее працаваць у камандзе і яго будуць акружаць спецыялісты з практычным вопытам. Прэзідэнт заўважыў, што энергетыка — вельмі спецыфічная сфера, у якой працуюць людзі з няпростым характарам. Аляксей Кушнарэнка не сумняваецца, што ў міністэрстве прымуць новага кіраўніка, гады яго працы ў якасці намесніка міністра, працы ў «Белгіпрапалівагаз» гэта паказалі.

«Улічваючы, што віцэ-прэм'ер у нас энергетык (Віктар Каранкевіч — былы міністр энергетыкі. — **Заўв.**), я думаю, што галіна не ўпадзе. Мы ўклаліся прыстойна ў энергетыку. Будзе дрэнна, калі ў тваю бытнасць міністра там нешта абрынецца. Ты гэта ведаеш, чалавек разумны, адукаваны», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

* * *

Дзяніс Мароз, размаўляючы з журналістамі, падкрэсліў, што дзяржавай у энергетыку ўкладзены даволі вялікія рэсурсы, найперш размова ідзе і аб будаўніцтве электрасеткавай інфраструктуры, і аб узвядзенні Беларускай атамнай электрастанцыі.



«Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу зрабіць так, каб цяпер гэта сістэма працавала максімальна эфектыўна для эканомікі, каб яна гарантавала надзейнае электразабеспячэнне і энергазабеспячэнне прамысловых аб'ектаў і сацыяльнай інфраструктуры. Я ўжо як міністр энергетыкі стаўлю задачай далейшае стратэгічнае развіццё энергасістэмы. Цяпер якраз надыходзіць перыяд стратэгічнага планавання на наступную пяцігодку. Мы ставім такія сістэмныя задачы, як далейшае павышэнне сістэм электразабеспячэння, прадстаўленне даклада кіраўніку дзяржавы аб другой атамнай электрастанцыі. І, вядома, стаіць задача працаваць з кадрамі як у кіраўніцкім асяроддзі, так і рыхтаваць кадры на ўзроўні выканаўцаў», — падзяліўся сваімі планамі з журналістамі міністр энергетыкі.

Ён расказаў, што будзе на максімум выкарыстоўваць свае веды, навуковы досвед для ўдасканалення энергетычнай сістэмы краіны: «Энергетыка не стаіць на месцы. Актыўна развіваюцца сістэмы назапашвання, якія ў найбліжэйшай будучыні сур'ёзна паўплываюць на тое, якім чынам будзе фарміравацца энергасістэма. Упэўнены, гэта знойдзе адлюстраванне і ў беларускай энергасістэме».

Што да будаўніцтва другой атамнай станцыі, Дзяніс Мароз расказаў: цяпер вядзецца падрыхтоўка да тэхнічных перагавораў, на якіх плануецца абмеркаваць параметры і ўмовы, пры якіх будзе магчыма рэалізацыя гэтага праекта.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

---

## ЯКІЯ КРЫТЭРЫІ ДА КАНДЫДАТАЎ ВЫЗНАЧАЛІ ВАШ ВЫБАР?




© Інфаграфіка БЕЛТА

## ЦІ ВЫВУЧАЛІ ВЫ ПРАГРАМЫ КАНДЫДАТАЎ У ПРЭЗІДЭНТЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ?




У апытанні Цэнтра сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ ўзялі ўдзел 1,5 тыс. беларусаў у розных рэгіёнах краіны, люты 2025.

© Інфаграфіка БЕЛТА

фіксуюць сацыёлагі, — сказала Ірына Лашук.

Яна адзначыла:

— Вядома, Прэзідэнт краіны павінен мець вялікі вопыт кіруючай дзейнасці. Натуральна, палітычныя перакананні. Мы выдатна разумеем, што ў краіны павінен быць выразны, зразумелы, усвядомлены, паслядоўны палітычны курс. І гэта падтрымліваюць людзі. Вядома, прэзідэнт павінен быць чалавекам адукаваным і кампетэнтным. Усе гэтыя тры пазіцыі, сапраўды, вельмі важныя і аб'ектыўныя.

Што тычыцца заслуг або дасягненняў, гэтая пазіцыя нашмат ніжэйшая за астатнія, падкрэсліла сацыёлаг.

— Заслугі і дасягненні — больш суб'ектыўны фактар. І важна, што людзі не разглядаюць нейкія біяграфічныя звесткі, чуткі, як гэта бывае ў іншых краінах падчас выбарчых кампаній. У нас такога няма і такая інфармацыя асабліва людзей не цікавіць. Як і сацыяльны статус кандыдатаў. Людзі мала разглядаюць такія характарыстыкі, як узрост, сямейнае становішча, даходы, маёмасць. Гэта для іх менш значна. Яны бачаць усё ж такі прэзідэнта як палітычнага лідара, — дапоўніла Ірына Лашук.

Як вынікае з даных сацапытання, больш за 60 % беларусаў вывучалі перадвыбарныя праграмы кандыдатаў у прэзідэнты.

Рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на пытанне: «Ці вывучалі вы праграмы кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь?» «Так» адказалі 61,4 % апытаных, «не» — 38,6 %.

— Калі людзі ў большасці сваёй вывучалі праграмы кандыдатаў у прэзідэнты — значыць, яны рабілі свядомы выбар, — адзначыла Ірына Лашук. — Зразумела, усе 100 % падрабязна праграмы кандыдатаў вывучаць не будуць. Калі казаць, напрыклад, аб перадвыбарнай праграме Аляксандра Лукашэнкі, то ўжо вельмі ўважліва вывучаць яе не было асаблівай патрэбы — беларусы выдатна ведаюць курс кіраўніка дзяржавы. Гэта добра, і людзі інфармаваныя. Разам з тым 61,4 % — сапраўды значная лічба. Значыць, людзі не проста ішлі на выбары. Яны зрабілі ўстойлівы, усвядомлены грамадзянскі выбар.

**Паводле БелТА.**

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНТАРЭС

# ПРЫНЯЦЬ ПРАВІЛЬНАЕ КІРАЎНІЧАЕ РАШЭННЕ

## Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын азнаёміўся з інвестпраектам Верхнядзвінскага масласырзавода



**Перспектывы развіцця аграпрамысловых аб'яднанняў разгледзелі ўчора на базе Верхнядзвінскага масласырзавода і Полацкага малочнага камбіната, якія ў рамках рабочага візіту на Віцебшчыну наведаў кіраўнік урада.**

Аляксандр Турчын адзначыў, што мэтай яго паездкі з'яўляецца азнаямленне з работай аграаб'яднання, створанага на базе Верхнядзвінскага масласырзавода.

Дырэктар ААТ «Верхнядзвінскі масласырзавод» Святлана Чывірава расказала, што ў склад аграхолдынга ўваходзіць восем арганізацый — перапрацоўчае прадпрыемства, прадпрыемства сэрвісу і шэсць сельгасарганізацый. Сёлета тут рэалізоўваецца інвестпраект у рамках праграмы «Адзін раён — адзін праект». Прадпрыемства плануе правесці мадэрнізацыю энергасістэмы, ачышчальных збудаванняў і пабудаваць новы цэх па вытворчасці смятаны. Сродкі на яго выдзелены Банкам развіцця.

— Для нарошчвання патэнцыялу прадпрыемства было прынята рашэнне аб мадэрнізацыі сістэм энергазабеспячэння, ачышчальных збудаванняў, і паралельна мы павялічваем аб'ёмы па вытворчасці масла, арганізоўваем вытворчасць смятаны. Кошт праекта ў цэлым складае 40,5 мільёна рублёў, з іх 25 % павінны складаць уласныя сродкі прадпрыемства. Дзякуючы гэтаму праекту мы зможам арганізаваць абслугоўваючую інфраструктуру належным чынам і ў належным аб'ёме, а пасля гэтага адкрыць цэх па вырабе смятаны магутнасцю 360 тон за год, павялічыць у два разы вытворчасць фасаванага масла. Цяпер з-за тэхнічных магчымасцяў мы фасуем толькі 50 % сметанковага масла, а астатняе прадаём у аптовай упакоўцы, — прыводзіць словы кіраўніка прадпрыемства інфармагенцтва БелТА.

Яна дадала, што летась вытворчасць прамысловай прадукцыі ўзрасла больш як на 35 % у параўнанні з 2023 годам.

— Мы вырабілі 10 тысяч тон сыру, 2,1 тысячы тон масла. Мы экспартна арыентаванае прадпрыемства, 90 % нашай прадукцыі паступае за мяжу. Асноўны кірунак па экспартных продажах — гэта сыр. У асноўным ён ідзе ў рэгіёны Расіі. Што датычыцца сухой сыроваткі, то тут геаграфія экспарту штогод пашыраецца. Мы рэалізоўваем гэту прадукцыю ў Кітай, асвоілі таксама новыя напрамкі — Філіпіны, Інданезія, Аман, Емен, Нігерыя, — праінфармавала дырэктар завода.

Святлана Чывірава адзначыла, што ў снежні 2023 года да аграхолдынга далучылі яшчэ адно прадпрыемства — Шумілінскі вытворчы цэх ААТ «Полацкі малочны камбінат», дзе паспелі ўжо замяніць частку абсталявання. У гэтым цэху плануюць правесці маштабнае тэхнічнае перааснашчэнне, каб павялічыць вытворчасць сыроў пад маркай «Ян Сыраробˮ» і пачаць выпуск сыру з блакітнай цвіллю.

— Калі казаць пра аграпрамысловыя аб'яднанні на прыкладзе Верхнядзвінскага, то разумна створаныя аб'яднанні працуюць і развіваюцца. Але, на жаль, ёсць і не такія паспяховыя прыклады, — адзначыў прэм'ер-міністр падчас нарады, якая прайшла на прадпрыемстве.

Па выніках нарады Аляксандр Турчын даручыў інтэнсіфікаваць развіццё малочнай жывёлагадоўлі ў Верхнядзвінскім раёне ў рамках патрабавання кіраўніка дзяржавы аб пераводзе да 2030 года дойнага статка на сучасныя тэхналогіі ўтрымання.

Мінсельгасхарчу даручана аказаць метадалагічную дапамогу ва ўкараненні перадавога вопыту пры будаўніцтве малочнатаварных комплексаў.

---

**Інтэграцыя ў грамадства людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця — адна з важных задач сацыяльнай дзяржавы. Асаблівая ўвага — маладым людзям: каб яны прайшлі навучанне, атрымалі прафесію, маглі самі сябе забяспечваць. Гэта праблема знаходзіцца на кантролі Савета Рэспублікі і асабіста яго старшыні. Пад кіраўніцтвам Наталлі Качанавай праходзяць пасяджэнні кансультатыўнага савета па гэтай тэме. У мінулым годзе такое пасяджэнне праводзілася на базе Мінскага дзяржаўнага каледжа лічбавых тэхналогій, дзе атрымліваюць прафесію маладыя людзі з асаблівымі патрэбамі ў навучанні. А на мінулым тыдні ў Нацыянальнай бібліятэцы гэтыя ўжо не навучэнцы, а маладыя спецыялісты атрымалі з рук Старшыні Савета Рэспублікі дыпломы аб заканчэнні каледжа.**

Учора чарговае пасяджэнне кансультатыўнага савета пад кіраўніцтвам Наталлі Качанавай прайшло на базе ААТ «Інтэграл», адзінага ў краіне прамысловага прадпрыемства, якое займаецца падрыхтоўку выпускнікоў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў дзяржаўнай сістэме «Дзяржзаказ і прыём». Падрыхтоўка рабочых ажыццяўляецца па спецыяльнасці «Тэхналогія вытворчасці вырабаў электроннай і мікраэлектроннай тэхнікі», юнакі і дзяўчаты атрымліваюць кваліфікацыю вымяральніка электратэхнічных параметраў вырабаў электроннай тэхнікі. Усяго на ААТ «Інтэграл» працуе 145 інвалідаў, у тым ліку 50 чалавек з парушэннем слыху.

Наталля Качанава, а таксама іншыя ўдзельнікі пасяджэння кансультатыўнага савета, у ліку якіх традыцыйна члены Савета Рэспублікі і кіраўнікі міністэрстваў, азнаёміліся з умовамі працы работнікаў ААТ «Інтэграл» з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Старшыня Савета Рэспублікі выказала ўдзячнасць кіраўніцтву прадпрыемства за стварэння для маладых людзей з асаблівасцямі развіцця ўмовы, якія дазваляюць ім працаваць і атрымліваць годную заработную плату.

Выступаючы на пасяджэнні кансультатыўнага савета, Наталля Качанава заўважыла, што ўсе пытанні, якія належала вырашыць на ўзроўні дзяржавы ў сістэмах аховы здароўя, адукацыі, працы і сацыяльнай абароны, вырашаны. «Але, калі людзі непасрэдна сутыкаюцца з нейкай праблемай, калі ў іх з'яўляюцца дзеці з асаблівасцямі ў развіцці, вядома, узнікаюць нейкія пытанні, — сказала яна. — Тут мы ўсе працуем на роўных. Мы не прымаем рашэнні, якія былі б навязаныя камусьці, мы проста прапаноўваем. І калі я прапанавала савет пры Савеце Рэспублікі зыходзячы з нашай работы са зваротамі грамадзян, міністры аховы здароўя, працы і сацыяльнай абароны, адукацыі, культуры, спорту і турызму выказалі жаданне з намі працаваць».

Спікер адзначыла, што «Інтэграл» можа служыць прыкладам адаптацыі людзей з асаблівасцямі ў нармальнае жыццё: «Рабяты маюць добры сацыяльны пакет, добрую заработную плату. І тое, што мы сёння ўбачылі, можна і трэба распаўсюджваць на ўсе прадпрыемствы, дзе працуюць такія людзі».



---

**У Авальнай зале Дома ўрада пад кіраўніцтвам Старшыні Палаты прадстаўнікоў Ігара СЕРГЯЕНКІ прайшоў семінар на тэму «Актуальныя пытанні прымянення заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове і выкарыстанні зямель на сучасным этапе». На ім дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены Савета Рэспублікі, кіраўнікі рэспубліканскіх мясцовых органаў улады, прадстаўнікі суддзейскага корпуса абмеркавалі даволі аб'ёмны спектр пытанняў, прааналізавалі дзеянні норм заканадаўства аб ахове і выкарыстанні зямель, прымяненне зямельнага заканадаўства, рэалізацыю норм і многае іншае.**

Планам падрыхтоўкі праектаў заканадаўчых актаў на 2025 год, зацверджаным кіраўніком дзяржавы, прадугледжана распрацоўка праекта закона па пытаннях рэгулявання зямельных адносін. Пра гэта на семінары заявіў Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка. Ён нагадаў прысутным, што новая рэдакцыя Кодэкса аб зямлі была прынята адносна нядаўна — у сярэдзіне 2022 года: «Гэта тэма абмяркоўвалася даволі доўга, было прынята канчатковае рашэнне, і адпаведна новая рэдакцыя пачала дзейнічаць з першага студзеня 2023 года. Практыка прымянення заканадаўства ў гэтай сферы, аналіз шматлікіх зваротаў грамадзян сведчаць аб наяўнасці шэрагу праблемных пытанняў, якія прыводзяць да неаднастайнага, а часам і няправільнага прымянення кодэкса. Першы блок такіх пытанняў складаюць выпадкі, калі ў падзаконных актах утрымліваюцца нормы, якія не адпавядаюць закону, але, тым не менш, актыўна прымяняюцца службовымі асобамі на практыцы. Як вынік — вялікая колькасць скаргаў землекарыстальнікаў на парушэнне іх правоў і законных інтарэсаў».

Абмяркоўвалі на семінары і вядомую тэму зямельнай амністыі. Паводле слоў спікера Палаты прадстаўнікоў, заяўнікі неаднаразова звярталіся з просьбай падоўжыць яе тэрмін: «Гэта ўжо было зроблена ў нядаўна прынятым намі Законе па пытаннях дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй. Сёння людзі таксама просяць пашырыць сферу інстытута зямельнай амністыі ў частцы падстаў прымянення кола асоб, на якіх яна распаўсюджваецца».

Трэці тэматычны блок, які абмеркавалі на семінары, — пытанні адносна працягласці тэрмінаў правядзення землеўпарадкавальных работ, вырабу матэрыялаў па адводзе зямельных участкаў, устанаўленне іх меж, прынятце рашэнняў на месцах па зямельных пытаннях. «Паводле інфармацыі ўрада, пэўныя крокі для ліквідацыі гэтых праблем ужо зроблены, засталося іх фармалізаваць у нарматыўных актах. Чацвёрты блок — кошт адпаведных працэдур. Паступаюць звесткі аб даволі высокім кошце як землеўпарадкавальных работ, так і аплаты іх легалізацыі, але гэта толькі частка праблем», — заўважыў Ігар Сергяенка.



САЦЫЯЛЬНЫ КЛОПАТ

# «ТУТ МЫ ЎСЕ ПРАЦУЕМ НА РОЎНЫХ»

**Пад кіраўніцтвам Наталлі КАЧАНАВАЙ на базе «Інтэграла» прайшло пасяджэнне кансультатыўнага савета па пытаннях сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця**



**Наталля Качанава канстатавала, што кансультатыўны савет вывучыў практычна ўсе этапы інтэграцыі людзей з асаблівасцямі: «Мы паглядзелі, як рыхтуюць сёння спецыялістаў у Мінскім дзяржаўным каледжы лічбавых тэхналогій. І я рада таму, што ў нас ёсць установы, якія рыхтуюць такіх спецыялістаў».**

У 2024 годзе выпуск па ўсіх узроўнях прафесійнай падрыхтоўкі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця склаў 423 чалавекі. А ў 2024—2025 навучальным годзе ва ўстановы прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі ўжо прынята 614 такіх дзяцей, паведаміла спікер Савета Рэспублікі.

На пасяджэнні кансультатыўнага савета запрашаюцца бацькі, сваякі тых маладых людзей, якія сёння сутыкнуліся з гэтымі праблемамі, яны могуць выступіць і расказаць, што яшчэ трэба зрабіць і якія праблемы застаюцца. «Мы будзем працягваць працаваць і збірацца для іх абмеркавання па меры таго, як у нас будуць назапашвацца нейкія звароты, прапановы, яшчэ нейкія пытанні, якія будуць звязаны з інклюзіўнай адукацыяй, з інтэграцыяй у жыццё маладых рабят, якія маюць асаблівасці ў сваім развіцці», — запэўніла Наталля Качанава.

**«Вы бачыце, што сёння дзяржава клапоціцца аб кожным маладым чалавеку, аб кожным дзіцяці — аб усіх грамадзянах нашай краіны, — сказала Старшыня Савета Рэспублікі. — На цырымоніі інаўгурацыі Прэзідэнта нашай краіны прагучала шчырае выступленне кіраўніка дзяржавы. Даходзіць да кожнага, калі Прэзідэнт гаворыць аб тым, што выдатныя людзі жывуць у нашай краіне, што ён кожнага цэніць. І гэта так і ёсць. Таму наша задача сёння — падставіць плячо ў тых пытаннях, дзе ёсць нейкая несправядлівасць. Тое, аб чым гаворыць заўсёды Аляксандр Рыгоравіч, — перш за ўсё павінна быць справядлівае стаўленне да людзей».**

Адным з разгледжаных удзельнікамі пасяджэння пытанняў стала стварэнне ўмоў для прафесійнага станаўлення работнікаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў прамысловай галіне, формах і метадах работы з імі.

Акрамя таго, на пасяджэнн былі і разгледжаны пытанні законных прадстаўнікоў непаўналетніх, якія звярнуліся ў Савет Рэспублікі.

Падводзячы вынікі работы кансультатыўнага савета, Старшыня Савета Рэспублікі даручыла правесці глыбокі аналіз таго, як арганізавана работа па прадастаўленні прафесійнай адукацыі і працаўладкаванні людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў цэлым у краіне. Наталля Качанава таксама прапанавала наступнае пасяджэнне правесці з выездам у рэгіён.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**
**Фота ТГ-канала Савета Рэспублікі.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# ПАПРАЎКІ ДЫКТУЕ ЖЫЦЦЁ

**Якіх змяненняў чакаць у заканадаўстве аб зямлі?**



Перад семінарам яго ўдзельнікі азнаёміліся з выстаўкай геадэзічнага абсталявання.

Ён дадаў, што з мінулага года дэпутацкім корпусам вядзецца работа па сістэматызацыі пытанняў, прапаноў па ўдасканаленні зямельнага заканадаўства: «Такія прапановы акумуляваны, накіраваны ў Дзяржаўны камітэт па маёмасці. Профільная пастаянная аграрная камісія таксама ўдзельнічае ў распрацоўцы праекта закона па пытаннях урэгулявання зямельных адносін. Нам неабходна прадметна абмеркаваць пытанні, якія ўзнікаюць, у тым ліку праблемныя, выпрацаваць шляхі вырашэння, намеціць арыенціры далейшай сумеснай работы па ўдасканаленні зямельнага заканадаўства», — абазначыў Ігар Сергеенка задачы для ўдзельнікаў семінара.

Кіраўнік дзяржавы пастаянна акцэнтуе ўвагу дзяржаўных органаў кіравання, мясцовых органаў кіравання на неабходнасць наведзення парадку на зямлі, выканання мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні тэрыторый населеных пунктаў, а таксама ўцягванне ў абарот зямельных участкаў, што не выкарыстоўваюцца, і пустых жылых дамоў. **Намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Мікалай БАБЕР** адзначыў: «Сённяшні семінар якраз-такі і быў прызначаны для таго, каб абмеркаваць тыя прапановы, якія да нас паступаюць. Яны накіраваны, у першую чаргу, на аптымізацыю самой працэдуры канфіскацыі і выдзялення зямельных участкаў, яе спрашчэння, скарачэнне тэрмінаў выканання работ і павышэнне эфектыўнасці прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў».

Мікалай Бабер падкрэсліў, што ў гэту работу актыўна ўключыліся дэпутацкі корпус Палаты прадстаўнікоў, члены Савета Рэспублікі, спецыялісты розных дзяржорганаў, мясцовыя органы выканаўчай улады: «І мы хочам стварыць заканадаўства, якое ў поўнай меры дазволіла б павысіць эфектыўнасць уцягвання зямель, што не выкарыстоўваюцца, у абарот, а таксама стварыць спрыяльныя ўмовы для рэгулявання зямельных адносін і кіравання зямельнымі рэсурсамі ў нашай краіне».

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы Іван МАРКЕВІЧ** заявіў, што пытаннямі прымянення заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове і выкарыстанні зямель на сучасным этапе ў камісіі займаюцца актыўна, падобны семінар праводзілі і да гэтага. «Кодэкс аб зямлі дзейнічае, у яго была ўкладзена сапраўды вялікая, значная работа, — заўважыў ён. — За гэтыя два гады назапасілася шмат нюансаў, якія мы абавязаны разгледзець. Гэта і звароты грамадзян, якія людзі накіроўваюць у парламент нашай краіны, у аблвыканкамы, у іншыя выканаўчыя ўлады. Гэта і каля 370 пытанняў, якія паступілі да нас па Кодэксе аб зямлі. Наша задача — уважліва вывучыць гэтыя пытанні на семінары і ўнесці змены і дапаўненні».

Іван Маркевіч адзначыў, што людзі ўдзячныя за прынятую зямельную амністыю. Пры гэтым сёння яны просяць паскорыць пытанне атрымання дакументаў зямельнага характару. «Ну і таксама, як заўсёды, нашых людзей хвалюе аплата. У цэлым, гэты законапраект яшчэ не паступіў у парламент, ён у найбліжэйшыя тры месяцы паступіць да нас. І я думаю, што мы ўзмоцнена, прадметна, сістэмна будзем працаваць над тым, каб у першым і ў другім чытаннях сёлета прыняць гэтыя папраўкі ў Зямельны кодэкс».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота БелТА.**




PARITETBANK
твой и цифровой

**Вниманию акционеров открытого акционерного общества «Паритетбанк»**

*(местонахождение общества: г. Минск, ул. Киселёва, 61а)*

Открытое акционерное общество «Паритетбанк» (далее – банк) сообщает, что годовым Общим собранием акционеров банка 26 марта 2025 г., протокол № 2,

принято решение:

- объявить дивиденды по итогам работы банка за 2024 год по привилегированным акциям – в размере 0,000048 белорусского рубля на одну акцию; по простым (обыкновенным) акциям выплату дивидендов не производить;

- установить срок выплаты дивидендов по привилегированным акциям – начиная с 25 апреля 2025 г. с учетом требований законодательства и устава банка.

Список акционеров, имеющих право на получение дивидендов, составлен в соответствии с реестром акционеров банка по состоянию на 3 марта 2025 г.

Выплату дивидендов акционерам банка осуществить:

- юридическим лицам в безналичном порядке в соответствии с законодательством;

- физическим лицам в безналичном порядке в соответствии с законодательством либо в установленном порядке наличными денежными средствами.

**Телефон для справок +37517 311 45 37.**

**https://www.paritetbank.by**

ОАО «Паритетбанк». УНП 100233809.
Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 13 февраля 2024 года № 5

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **№ 2025.Ч.002.00074** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** ОАО «Знамя индустриализации», 210017, Республика Беларусь, г. Витебск, ул. Гагарина, 11.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63; e-mail: vcm74@mail.ru; **https://etpvit.by.**

**Дата и время проведения торгов: 26.04.2025 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-202473 площадью 5187,90 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 11-1 (места общего пользования), назначение – административное помещение, наименование – административное помещение, на подвальном этаже – лестничная клетка 15,5 кв. м; на 1-м этаже – лестничная клетка 19,7 кв. м, лестничная клетка – 16,6 кв. м, тамбур – 7,1 кв. м, бетонное крыльцо – 9 кв. м, бетонное крыльцо – 3 кв. м), расположенное на земельном участке с кадастровым номером № 240100000001005132 площадью 4 2264 га (общая долевая аренда).

**Объекты недвижимости имеют обременения:**

1. Ипотека, залогодержатель – юридическое лицо, резидент Республики Беларусь – республиканское унитарное производственно-торговое предприятие «Оршанский льнокомбинат».

2. Договора аренды №10 от 01.10.2023 действует по 30.09.2026, № 10 от 01.07.2021 действует по 29.06.2025, № 6 от 01.04.2023 действует по 31.03.2027, № 7 от 17.04.2023 действует по 16.04.2026, № 8 от 01.07.2023 действует по 30.06.2026, № 3 от 29.02.2024 действует по 28.02.2025, № 13 от 08.11.2022 действует по 07.11.2024.

**Нач. цена: 2 325 600,00 бел. руб. без учета НДС.**
**Задаток: 232 560,00 бел. руб.**

Электронные торги проводятся в соответствии Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» etpvit.by

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 25.04.2025.**

**Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия электронных торгов**: Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, в т. ч. расходы связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, расходы Продавца на проведение оценки предмета эл. торгов, оплатить услуги Оператора ЭТП; подписать договор купли-продажи в течение 20 календарных дней со дня проведения электронных торгов; оплатить предмет эл. торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи; оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета электронных торгов. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения.

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество.

Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375445928209, Светлана Георгиевна.

# ПУНКТЫ РОСТУ

## Станкабудаванне і праектаванне метро: якія перспектывы супрацоўніцтва Беларусі з Новасібірскай вобласцю

**Намеснік прэм'ер-міністра Віктар КАРАНКЕВІЧ у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» падзяліўся вынікамі рабочага візіту ўрадавай дэлегацыі Беларусі ў Новасібірскую вобласць.**



Падчас нядаўняга візіту ў Новасібірскую вобласць урадавая дэлегацыя наведала шэраг прамысловых прадпрыемстваў, якія ўяўляюць цікавасць для суб'ектаў гаспадарання Беларусі. Па словах Віктара Каранкевіча, абмеркавалі, у прыватнасці, пытанні, звязаныя з нафтаперапрацоўкай, нафтаздабычай.

— Паміж канцэрнам «Белнафтахім» і гэтымі прадпрыемствамі ёсць пэўныя напрамкі для супрацоўніцтва, якія патрабуюць прапрацоўкі. Гэта можа быць дадатковымі сферамі ўзаемадзеяння. Акрамя таго, актуальнай тэмай для развіцця ўзаемадзеяння стала станкабудаванне. Мы таксама наведалі адно з прадпрыемстваў, якое выпрабляе шпіндзелі, якія па якасці і па ўзроўні не саступаюць сусветным, — расказаў віцэ-прэм'ер.

Падчас рабочага візіту пазначаная зацікаўленасць расійскага рэгіёна ва ўдзеле беларусаў пры праектаванні новых станцый дзяржынскай лініі метро ў Новасібірску.

— Першы этап ужо, можна сказаць, рэалізаваны. Беларуская арганізацыя ўдзельнічае ў праектаванні гэтых станцый метро. Вядома, будзем зацікаўлены з улікам назапашаных кампетэнцый і наяўнасці магчымасцяў у рэалізацыі самога будаўніцтва гэтых станцый метро, — падкрэсліў ён.

Гэта таксама новы напрамак, які Віктар Каранкевіч ацаніў як доўгатэрміновы на перспектыву.

Акрамя таго, у рамках візіту ўрадавай дэлегацыі ў расійскім рэгіёне быў адкрыты мультыбрэндавы цэнтр «Беларускія машыны», а ўжо сёлета Беларусь наладзіць пастаўкі кар'ернай тэхнікі ў Новасібірскую вобласць.

Што датычыцца канкрэтных планаў па пастаўках тэхнікі, то наша краіна паставіць у Новасібірскую вобласць каля 20 адзінак кар'ерных самазвалаў.

Па словах Віктара Каранкевіча, сёлета Беларусь адновіць пастаўкі кар'ернай тэхнікі ў Новасібірскую вобласць. Рэалізацыя гэтых праектаў знаходзіцца ў дастаткова высокай ступені гатоўнасці.

— Пачынаючы з другога паўгоддзя 2025 года будзе пастаўлена каля 20 адзінак. Гэта тэхніка на перыяд 2025—2026 гадоў. Адпаведна прапрацоўваецца пытанне стварэння ў Новасібірску цэнтра тэхнічнай падтрымкі кар'ерных самазвалаў, што таксама будзе пэўным стымулам у развіцці здабыўной галіны з ужываннем сучаснай кар'ернай тэхнікі беларускай вытворчасці і аказаннем сучаснага і якаснага сэрвісу, — адзначыў ён.

Падчас візіту таксама былі вызначаны дэталёвыя напрамкі супрацоўніцтва на ўзроўні кіраўнікоў асобных ведамстваў, дзяржорганаў, а таксама прадпрыемстваў.

— Дакументы, якія цяпер падпісаныя або знаходзяцца ў высокай ступені гатоўнасці, павінны ўжо пачынаючы з 2025 года прыносіць вынік. Гэта задачы, пастаўленыя на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў. У рамках Саюзнай дзяржавы асаблівая ўвага аддаецца міжрэгіянальнаму развіццю. У цяперашні час з улікам знешнепалітычнай сітуацыі і абмежаванняў, якія адбываюцца, гэты напрамак з'яўляецца асноўнай рухаючай сілай ва ўмацаванні развіцця беларуска-расійскіх адносін, — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.




**Кампетэнтна**

# АД ПРАДУКТАЎ ХАРЧАВАННЯ ДА АВІЯБУДАВАННЯ

## Беларусь плануе пашырыць узаемадзеянне з Расіяй у розных напрамках



Пра гэта паведаміў **пасол Беларусі ў Расіі Аляксандр РАГОЖНІК** у эфіры тэлеканала «Беларусь 1».

Па яго словах, дзейнасць па стварэнні цэнтраў беларускай тэхнікі Беларусь распачала яшчэ два гады таму.

— Першым цэнтрам стаў беларускі цэнтр на базе трактарнага завода ў Татарстане. Ён паказаў сваю актуальнасць і, самае галоўнае, выконвае ўсе задачы, якія былі пастаўлены Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам. Мы прыйшлі з усёй лінейкай тэхнікі — пачынаючы ад пасяўнога агрэгата і заканчваючы ўборачным камбайнам. Гэта значыць сёння любая гаспадарка можа набыць у адным месцы не асобна ўзятую тэхніку, а тэхналогію. Гэта задача паспяхова выканана. Ужо зацверджана дарожная карта па стварэнні такіх цэнтраў па Расійскай Федэрацыі, — паведаміў дыпламат.

Як адзначыў Аляксандр Рагожнік, трэці такі комплекс будзе адкрыты ў Кемераве ў чэрвені. Гэта будзе знакавы пілотны праект, дзе будзе прадстаўлена і кар'ерная тэхніка, якая ўжо працуе ў рэгіёнах і паспяхова сябе зарэкамендавала.

— Але гэта толькі невялікая частка працы мультыбрэндавых цэнтраў, якую мы вядзём. Сёння Беларусь павінна ісці па шляху стварэння сумесных прадпрыемстваў з рознымі профільнымі холдынгамі ў Расійскай Федэрацыі. І такая праца па даручэнні прэм'ер-міністра ўжо пачатая. Намі сфарміраваны пул меркаваных праектаў. У ім будзе задзейнічана больш за 10 прадпрыемстваў. Сёння з Расіяй гэта магчымасць прапрацоўваецца для таго, каб гэта супрацоўніцтва ўмацоўвалася і рухалася наперад, — падзяліўся планамі ён.

Аляксандр Рагожнік дадаў, што ў асноўным гэта будуць машынабудаўнічыя прадпрыемствы, але ёсць і іншыя сферы.

— Мы ставім перад сабой задачу пайсці далей, напрыклад у галіне авіябудавання, і тую праграму, якая падпісаная, пашырыць да 2035 года. Трэба распрацаваць вялікую праграму ў галіне авіябудавання, дзе можна было б задзейнічаць, акрамя 558-га авіяцыйнага рамонтнага завода, які рэалізуе праект па «Асвеі», яшчэ і Мінскі завод грамадзянскай авіяцыі № 407, які займаецца мадэрнізацыяй. Неабходна ўключыць у гэту праграму і Аршанскі авіярамонтны завод, каб разумець, як будзем працаваць далей, — адзначыў Аляксандр Рагожнік.

Беларусь славіцца не толькі машынабудаваннем, але і легпрам актыўна заходзіць у расійскія рэгіёны. На пытанне, ці актуальны для Расіі праект «Да дому», пасол адказаў, што гэтыя праекты прыносяць вынік, але Рэспубліка Беларусь пайшла крыху далей.

— Нашу краіну наведалі прадстаўнікі аднаго з найбуйнейшых рытэйлаў — сеткі «Ашан». Менавіта ў гэтую працу і быў уключаны легпрам. Сёння гэты рытэйлер зацікаўлены ў набыцці ўсяго спектра лёгкай прамысловасці, пачынаючы з ільняных вырабаў і заканчваючы прадукцыяй БХПА, — адзначыў дыпламат.

Разам з тым актыўна Беларусь прасоўвае на расійскі рынак харчовую прадукцыю. Гэтая тэма ў тым ліку была ключавой на сустрэчах з прадстаўнікамі расійскай гандлёвай сеткі.

— Мы перайшлі да заключэння прамых кантрактаў з тымі, хто прадае. Па сутнасці справы, мы прыбіраем сярэдняе звяно дылераў, якія таксама фарміруюць нацэнку на прадукт. І сёння задача, якая ставілася Прэзідэнтам, выконваецца. Калі мы гэтую задачу вырашым, то прысутнасць на расійскім рынку беларускага харчавання значна павялічыцца, — растлумачыў Аляксандр Рагожнік.

**Па матэрыялах БелТА.**

# АБ ШТУЧНЫМ ІНТЭЛЕКЦЕ І РАШАЮЧЫМ СЛОВЕ КАМАНДЗІРА

## Першы намеснік міністра абароны пракаментаваў вынікі праверкі баявой гатоўнасці Узброеных Сіл

**На мерапрыемствах па праверцы баявой гатоўнасці Узброеных Сіл, якая па даручэнні Прэзідэнта праводзілася Дзяржаўным сакратарыятам Савета Бяспекі, супрацьпаветраная абарона адпрацавала эфектыўна. Такое меркаванне ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1» выказаў начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Павел МУРАВЕЙКА.**

«Экзамен трымалі сістэмы супрацьпаветранай абароны. Мы праводзілі маштабнае мерапрыемства для ацэнкі іх здольнасцяў выкрываць дзеянні паветранага праціўніка, рэагаваць на іх. Мы выкарыстоўвалі новыя прыёмы і спосабы, разгортвалі новую сістэму назірання, стваралі часовыя раёны абароны і гэтак далей. Наша супрацьпаветраная абарона адпрацавала даволі эфектыўна, — адзначыў Павел Муравейка. — Органы кіравання дзейнічалі зладжана, а тэхнічная аснова, якую яны стварылі і разгарнулі, пакрыўшы сеткай наглядальных і радыёлакацыйных пастоў Рэспубліку Беларусь, дае магчымасць кантраляваць паветраную прастору. Дзеянні зенітна-ракетных войскаў і авіяцыі паказалі, што падраздзяленні да выканання задач гатовыя».

Вядома, трэба правесці комплекс мерапрыемстваў па ацэнцы аб'ектыўнага кантролю, але ўражанні і ўспрыманне дзеянняў, паводле яго слоў, вельмі пазітыўныя. Павел Муравейка быў побач з камандуючым, які кіраваў баявымі дзеяннямі, таму ацаніць іх змог асабіста. «Гэта ўпэўненыя, зладжаныя, надзейныя дзеянні, якія даваляюць радавацца за тое, што ў нас такая падрыхтаваная сістэма супрацьпаветранай абароны», — падкрэсліў першы намеснік міністра абароны.

У час праверкі з улікам вопыту сучасных ваенных канфліктаў было спланавана, між іншым, і задзейнічанне беспілотных лятальных апаратаў. «Мы імкнёмся ісці ў нагу з часам, і БЛА — гэта рэаліі сучаснай вайны і сучаснага бою. У ходзе праверкі яны вырашалі цэлы комплекс задач — вядзенне разведкі з выдачай адпаведных каардынат для агнявога паражэння, карэкціроўка агню артылерыі. Мы нават адпрацавалі такую спецыфічную задачу, як карэкціроўка стральбы танкаў на вялікія адлегласці з выкарыстаннем беспілотных лятальных апаратаў. Акрамя таго, інтэнсіўна прымяняліся такія прыёмы, як мініраванне і размініраванне мясцовасці з выкарыстаннем беспілотных лятальных апаратаў, пастаноўка дымавых перашкод, кіраванне каардынацыяй дзеянняў штурмавых груп ва ўмовах абмежаванай бачнасці ў лясіста-балоцістай мясцовасці. Гэта значыць рэальна беспілотнікі праніклі фактычна ў кожны элемент падрыхтоўкі падраздзяленняў воінскіх часцей», — растлумачыў Павел Муравейка.





Усё атрымалася, але ёсць нюансы, на якія трэба звярнуць увагу. Сярод іх першы намеснік міністра вылучыў неабходнасць нарошчвання колькасці беспілотнікаў, а таксама наяўнасць дублюючых спецыялістаў па іх кіраванні. «Часам беспілотны лятальны апарат 24/7 вісеў у паветры з пасадкай або ўзлётам іншага для таго, каб забяспечыць пастаянную выдачу інфармацыі. Трэба таксама навучыць крыху хутчэй рэагаваць, вывучаць, перадаваць каардынаты на сродкі агнявога паражэння. Чаму? Таму што абстаноўка вельмі хутка змяняецца, — заўважыў першы намеснік міністра абароны. — Мы бачым гэтыя пытанні, вызначылі тыя методыкі, якія трэба дадаць у навучанне. Думаю, у нас усё атрымаецца ў рамках далейшай падрыхтоўкі. Падчас наступнай праверкі гэта ўвогуле зойме лідзіруючае месца ў працэсе навучання і падрыхтоўкі войскаў».

Яшчэ немалаважны аспект — з беспілотнікамі змагаюцца з выкарыстаннем сродкаў радыёэлектроннай барацьбы, і гэты элемент быў апрабаваны ў рамках падрыхтоўкі. «Скажу адразу: ёсць ад беспілотнікаў «проціяддзе», і працуе яно дастаткова эфектыўна. Не буду апускацца ў назвы тых ці іншых сістэм, але аб'ектыўна магу сказаць, што там, дзе правільна былі прыменены сродкі радыёэлектроннай барацьбы, беспілотнікі страцілі сваё панаванне над полем бою», — падкрэсліў першы намеснік міністра абароны.

Штучны інтэлект — добрая дапамога, але апошняе рашэнне застаецца за камандзірам. Павел Муравейка падкрэсліў, што поспех у ваеннай справе сёння грунтуецца найперш на волі, а інтэлект толькі падказвае найбольш лёгкі спосаб дасягнення гэтага поспеху. «Так, сёння вайна — гэта вайна інтэлектаў, але інтэлект абапіраецца на волю і на класічныя дзеянні, якія ў той ці іншай сітуацыі выкарыстоўваюцца, — адзначыў першы намеснік міністра абароны. — Мы бачым поле бою, мы ведаем аб праціўніку, але хтосьці з нас выйграе. І той, хто прыдумаў больш дасканалыя спосабы дзеянняў, той і пераможа. Безумоўна, цяпер вельмі шмат гавораць пра штучны інтэлект, які гатовы дапоўніць нашу аб'ектыўную ваенную рэчаіснасць. Гэта добрая дапамога ў працэсе абгрунтавання прыняцця рашэнняў, правядзення пэўных разлікаў, мадэлявання сітуацый, але ўсё роўна апошняе рашэнне застаецца за чалавекам, за камандзірам».

Павел Муравейка нагадаў выказванне аб тым, што ў ваеннай справе любыя дзеянні можна абгрунтаваць матэматычна, але вядзенне вайны застаецца мастацтвам. «Таму ваеннае мастацтва — гэта ўсё ж такі мастацтва, якое грунтуецца на ўспрыманні чалавекам тых працэсаў, якія адбываюцца. Штучны інтэлект, натуральна, напоўніць нашу рэчаіснасць у найбліжэйшай перспектыве. Ён ужо ёсць у нас у асобных падраздзяленнях сувязі, мадэлявання, інфармацыйных тэхналогій, якія выкарыстоўваюцца. Прыйдзе час, і штучны інтэлект, магчыма, будзе кіраваць і танкам, але пакуль за рычагамі баявых волатаў сядзіць чалавек і ён з'яўляецца адзінай асобай, якая прымае рашэнне і ставіць апошнюю кропку».

**Паводле БелТА.**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «МОГОТЕКС», г. Могилев, ул. Гришина, 87. УНП 700116054 |
| **Оператор/ адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |
| **Предмет электронного аукциона** | |
| **Магазин** (**911.4 кв. м,** инв. № 700/С-62152, составные части: подвал), по адресу: **Могилевская обл., г. Могилев, ул. 30 лет Победы, 28А** | |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0934 га,** предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания магазина | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 484 200,00 бел. руб.** (снижена на 50 %). Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать) календарных дней** со дня завершения электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение 2 % от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона | |
| Предыдущее извещение по лоту № 1 опубликовано в газете «Звязда» от 04.03.2025 | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 14.04.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 11.04.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 17-310-36-37, +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by** | |

**Закрытое акционерное общество «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7»,**
*местонахождение: г. Минск, ул. Аранская, 13, каб. 15,*
доводит до сведения своих акционеров информацию
о принятии 27.03.2025 годовым общим собранием акционеров решения об объявлении и выплате дивидендов,
в соответствии с которым утвержден размер дивидендов за 2024 год, приходящийся на одну простую акцию Общества, равный 8,65 бел. руб., и назначен срок выплаты дивидендов – по 31.12.2025 включительно,
путем перечисления причитающихся сумм на банковский счет лица, имеющего право на получение дивидендов.
*Совет директоров ЗАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7».*
УНП 100088916

**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества **ООО «АВКОМ СИСТЕМ»** (УНП 192745581),
объявляет о проведении **02.05.2025 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrot-torg.by
Полный перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте ЭТП **bankrot-torg.by**

**ООО «СпецРеализация»**
**объявляет о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – частного торгового унитарного предприятия «САРАСВАТИ»**
*(УНП 191090080, г. Минск, пр-т Рокоссовского, д. 2, пом. 17)*

***Дата и время проведения торгов*: 02 мая 2025 года.**
Начало – 12.00. Заявки принимаются с 01 апреля 2025 года по 30 апреля 2025 года.
***Место проведения торгов:*** г. Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».
***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.
***Продавец:*** **ЧП «САРАСВАТИ» (УНП 191090080), в лице ликвидатора — директора ООО «Юридическое агентство «КлеверКонсалт» Колыско А. А.**
Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интерент-сайте https://specrealization.by
Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 09.00 до 17.00) +375296847176

# ЗЯЛЁНАЯ СПАДЧЫНА ЎНУКАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Даручэнне Прэзідэнта пачалі выконваць безадкладна — увосень правялі першы этап лесааднаўлення ў пацярпелых ад леташняй стыхіі рэгіёнах. З 21 сакавіка ў нашай краіне праходзіць грамадская добраахвотная акцыя «Дай лесу новае жыццё!», у рамках якой плануецца завяршыць аднаўленне пашкоджаных ліпеньскім ураганам лясоў, а гэта 6 тысяч гектараў. З гэтай мэтай будзе высаджана 35—40 мільёнаў саджанцаў, паведамляе БелТА са спасылкай на **міністра лясной гаспадаркі Аляксандра КУЛІКА**. У суботу 29 сакавіка — першыя цёплыя выхадныя пасля халадоў — валанцёры, прафсаюзы і кіраўнікі рэгіёнаў з энтузіязмам далучыліся да высакароднай справы.

## Лес ад прафсаюза

Больш за 30 тысяч сеянцаў хвоі і бярозы пасадзіла прафсаюзная каманда паўднёва-ўсходняга рэгіёна на падрыхтаванай пасля леташняга буралому тэрыторыі ў Гомельскім раёне, паведамляе БелТА. Каля 50 прадстаўнікоў прафсаюзнага руху Гомельскай вобласці працавалі на плошчы ў Даўгалескім лясніцтве Гомельскага вопытнага лясгаса. Новы лес на гэтай тэрыторыі закладзены з лёгкай рукі прадстаўнікоў абласнога аб'яднання прафсаюзаў сумесна са старшынямі абласных арганізацый галіновых прафсаюзаў, членамі маладзёжнага савета, лідарамі «пярвічак» і прадстаўнікамі прафсаюзнага актыву рэгіёна.



**Галоўны тэхнічны інспектар працы абласнога аб'яднання прафсаюзаў Анатоль ЛАПУЦЬ** упэўнены: кожны чалавек цягам жыцця павінен пасадзіць хоць бы адно дрэва. «Мы сёння калектыўна вырашаем пытанне аднаўлення лясного багацця нашай вобласці, нашай краіны. Стваральная і карысная праца абавязкова прынясе вынікі ў будучым», — сказаў ён.

**Генеральны дырэктар Гомельскага дзяржаўнага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання Ігар ДЗЕГЦЯРЫК** не сумняваецца, што пастаўленыя перад галіной задачы па лесааднаўленні будуць выкананы. «Так, на месцы, дзе сёння прафсаюзныя каманды высаджваюць хвоі і бярозы, да ўрагану быў добры, саспелы лес. Пасля разгулу стыхіі ўсе бураломныя ўчасткі распрацавалі, а цяпер ідзе аднаўленне. Складанасцяў ніякіх няма, удзельнічае шмат валанцёраў. Мы адчуваем гэту падтрымку і дапамогу», — падкрэсліў ён.

У асобных рэгіёнах мерапрыемствы па лесапасадцы былі праведзены раней. Напрыклад, на тэрыторыі Воранаўскага лясніцтва Віцебскага лягаса прадстаўнікі абласной арганізацыі прафсаюза работнікаў лесу і прыродакарыстання высадзілі больш за 17 тысяч саджанцаў. А калектыў і прафактыў Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка навялі парадак пасля зімы на тэрыторыях Брагінскага, Нараўлянскага і Хойніцкага раёнаў і высадзілі каля 70 тысяч сеянцаў хвоі звычайнай. Да акцыі далучыліся і калектывы філіялаў «Мазырскія электрычныя сеткі» і «Мазырская ЦЭЦ» РУП «Гомельэнерга». Энергетыкі высадзілі каля 10 тысяч сасновых саджанцаў на найбольш пацярпелых участках лясоў Мазыршчыны.

**Каля 1,6 мільёна саджанцаў высадзяць падчас рэспубліканскай акцыі «Дай лесу новае жыццё!» у Магілёўскай вобласці. У цэлым па вобласці ў вясновы лесакультурны фонд запланавана пасадка на больш як 2,7 тысячы гектараў. З іх каля 1 тысячы гектараў — гэта аднаўленне лясоў на пацярпелых ад леташняй непагадзі тэрыторыях. Дарэчы, магілёўскія лесаводы прыдумалі для валанцёраў тэматычныя конкурсы: самы актыўны клас і школа і індывідуальны фотаконкурс.**

## Сімволіка мірных дзесяцігоддзяў

У паўночным рэгіёне месцам шырокага старту рэспубліканскай акцыі стала тэрыторыя Суражскага лягаса ў Віцебскім раёне. На тэрыторыі ў 1,4 гектара **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН** разам з наменснікамі, начальнікамі структурных падраздзяленняў пасадзілі каля 10 тысяч сеянцаў хвоі і елкі.

Вельмі сімвалічна, што сёлета акцыя праходзіць напярэдадні 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, бо прыкладна праз 80 гадоў высаджаныя расліны стануць паўнавартаснымі дрэвамі для перапрацоўкі. Перад пачаткам акцыі «Дай лесу новае жыццё!» яе ўдзельнікі аддалі даніну памяці героям-вызваліцелям на мемарыяле ў гарадскім пасёлку Сураж, дзе знайшлі апошні прытулак амаль 400 чырвонаармейцаў. Кіраўнік вобласці канстатаваў, што суражская зямля вядомая на прасторах былых краін СССР як партызанскі край: тут змагаўся легендарны Бацька Мінай — Герой Савецкага Саюза Мінай Піліпавіч Шмыроў.

Падчас работы на будучым лясным масіве **Суражскага лягаса** яго дырэктар **Дзмітрый ПАДЛЕШЧУК** адзначыў, што па традыцыі з надыходам вясны ўсе ўключаюцца ў высакародную справу. «Мы ствараем лясныя культуры для будучых пакаленняў. Каб вырасціць добры лес, неабходна падрыхтаваць участак, апрацаваць глебу, высадзіць якасны пасадачны матэрыял, а потым на працягу сямі гадоў яго правільна даглядаць», — дадаў ён.

«Віцебская вобласць далучылася да важнай для ўсёй краіны акцыі. Упэўнены, што гэта толькі пачатак, аднак ужо шмат людзей удзельнічаюць. На працягу трох гадоў, не толькі вясной, але і восенню мы дапамагаем ствараць новы лес. Прыемна бачыць, як тыя культуры, якія высадзілі раней, выраслі і паволіператвараюцца ў дрэвы. Супольная праца заўсёды аб'ядноўвала беларусаў. І ў Год добраўпарадкавання хочацца, каб наша зямля становілася ўсё прыгажэй і ўтульней», — заключыў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН**.

Старт акцыі ў Полацкім раёне разам з прадстаўнікамі раённага Савета дэпутатаў, выканаўчай улады, ветэранскай арганізацыі, работнікамі Полацкага камбіната хлебапрадуктаў, ваеннаслужачымі Полацкага пагранічнага атрада, прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый даў кіраўнік дэпутацкага корпуса Віцебшчыны Дзмітрый Дзямідаў. На тэрыторыі Вароніцкага сельсавета ўдзельнікі высадзілі 6600 сеянцаў на плошчы 1,1 гектара.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

НА СВАЕ ВОЧЫ

# ЗАЗІРНУЦЬ ЗА ЗАЧЫНЕНЫЯ ДЗВЕРЫ

## Прамысловы турызм прывабны ў любы сезон




**Па выніках мінулага года Віцебская вобласць дасягнула рэкорднага паказчыка па экспарце турыстычных паслуг — больш за 25 мільёнаў долараў. Шматлікіх гасцей паўночнага рэгіёна цікавяць розныя кірункі: ад аздараўленчага да рэлігійнага турызму. Аднак у трэндах Падзвіння застаецца прамысловы. І хоць месячнік яго падыходзіць да завяршэння, у Віцебскім раёне шмат цікавых прадпрыемстваў, якія запрашаюць ахвотных круглы год.**

Віцебская бройлерная птушкафабрыка пастаянна нарошчвае аб'ёмы вытворчасці, пашырае асартымент і на сёння мае звыш 200 найменняў прадукцыі. Цяпер акрамя прадукцыі з мяса птушкі, выпускае яе ахаладжаную, так і замарожаную прадукцыю з ялавічыны. Прадпрыемства развіло і сваю моцную сетку грамадскага харчавання: у вёсцы Трыгубцы дзейнічае сталовая, у вёсцы Доўжа — рэстаран, ён, фірменны, ёсць і ў абласным цэнтры. Падчас экскурсіі на прадпрыемства можна ўбачыць увесь працэс вырошчвання і перапрацоўкі мяса птушкі ад сутачных куранят да гатовых паўфабрыкатаў.

Адна з папулярных лакацый, якая прывабілае турыстаў зімой нават больш, чым летам, — КСУП «Рудакова», а канкрэтна — цяпліцы гаспадаркі. Тут увесь год цеплыня і зеляніна, бо ў аранжарэях вырошчваюць таматы, агуркі, салату, кроп. Дарэчы, для апылення саджанцаў цяплічных таматаў у спецыяльных доміках жывуць мясцовыя пчолы! Свежую агародніну можна набыць на месцы. Аднак «Рудакова» спецыялізуецца не толькі на раслінаводстве: гаспадарка займаецца вытворчасцю малака, кармоў, вырошчвае бульбу і збожжавыя культуры.



Паглядзець на адзін з самых сучасных у краіне жывёлаводчых комплексаў можна ў вёсцы Мазалава, у філіяле СГП «Мазалавагаз» УП «Віцебскаблгаз». Тут разводзяць буйную рагатую жывёлу, займаюцца вырошчваннем збожжавых і кармавых культур, камбікармоў. Пяць гадоў таму прадпрыемства запусціла завод па перапрацоўцы алейных культур. Чалавечую сілу тут амаль поўнасцю замянілі сучасныя тэхналогіі. Асабліва цікава будзе ўбачыць робатаў, якія даглядаюць кароў на комплексах.

Аматарам апошніх аграрных тэхналогій з радасцю адчыняюць дзверы ў Віцебскім занальным інстытуце сельскай гаспадаркі НАН Беларусі. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства спецыялізуецца на вытворчасці высакаякаснага насеннага матэрыялу бульбы і ўдасканаленні рэгіянальных тэхналогій яе вырошчвання. Адным словам, бульбу самых якасных сартоў тут вырошчваюць у прабірках спосабам мікраклянальнага размнажэння! Акрамя гэтага, інстытут выводзіць элітныя сарты збожжавых, зернебабовых, крыжакветных культур. А яшчэ для дакладнага земляробства тут выкарыстоўваюць дроны.

Запрашае на экскурсіі і высокатэхналагічнае прадпрыемства ААТ «БелВітуніфарм», якое выпускае ветэрынарныя прэпараты для сельскагаспадарчай жывёлы і хатніх гадаванцаў. Завод з'яўляецца лідарам у галіне якасці і эфектыўнасці на рынку Рэспублікі Беларусь і замежных рынках. У каталогу прадпрыемства — звыш 150 найменняў прадукцыі, у ліку якіх вірусныя і бактэрыяльныя вакцыны, сывараткі, лекавыя прэпараты. Кампанія экспартуе тавар у Казахстан, Арменію, Егіпет, Турцыю, Туркменістан і іншыя краіны.

Канешне, кожны раён паўночнага рэгіёна славіцца сваімі прамысловымі флагманамі, якія маюць аўтарытэт далёка за межамі нашай Беларусі. А калі ёсць магчымасць на свае вочы ўбачыць тэхналагічныя працэсы, зразумець, які шлях да нашага стала праходзіць тая ж бульбіна, то ёй, гэтай магчымасцю, трэба абавязкова скарыстацца!

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**







**• На фронце**

Войскі 1-га Украінскага фронту з баямі прасоўваліся ўперад. «Совецкія пехацінцы і танкісты прарвалі нямецкую абарону на паўночным захадзе ад горада Ратыбор», — пісала наша газета ў гэты дзень. Праціўнік спешна перакінуў на гэты ўчастак значныя сілы пяхоты і танкаў і аказваў упартае супраціўленне. Палонныя паведамлялі, што нямецкае камандаванне аддала загад любой цаной утрымаць Ратыбор — моцны апорны пункт. Паводле звестак Савецкага інфармбюро, немцы, якія чакалі ўдару нашых войскаў з усходу і поўдня, умацавалі ўсходнія і паўднёвыя подступы да горада. Тут была пабудавана суцэльная паласа доўгачасовых умацаванняў. Зрабіўшы паспяховы абходны манеўр, нашы войскі ўварваліся ў Ратыбор з захаду. Яны паспяхова абыходзілі горад. Пасля ўпартых баёў франтавікі зламалі варожае супраціўленне і авалодалі горадам.

На 1-м Беларускім фронце на захадзе і паўднёвым захадзе ад горада Кістжынь (Кюстрын) франтавікі акружылі і знішчылі значны гарнізон немцаў, які абараняў раён паміж Вартай і Одэрам, пры гэтым узялі ў палон 3170 нямецкіх салдат і афіцэраў і захапілі палявых гармат — 54, кулямётаў — 150. Праціўнік пакінуў на полі бою да трох тысяч трупаў сваіх салдат і афіцэраў.

У раёнах Глогаў і Брэслаў нашы войскі прадаўжалі баі па знішчэнні акружаных груп нямецкіх войскаў.

**«Войскі 2-га Украінскага фронту, прадаўжаючы наступленне, авалодалі горадам Нітра і, фарсіраваўшы раку Ваг, з боем занялі горад Галанта — важны вузел дарог на шляхах да Брацыславы. У ходзе баёў за 31 сакавіка войскі фронту занялі больш 80 іншых населеных пунктаў, у тым ліку буйныя Кепешд, Шалья, Дзякоўцэ, Перэд, Жыгард, Горні Салібі, Мостова Керць, Гута, Землянска-Олча, Тані і чыгуначныя станцыі Шалья, Перэд, Жыгард, Недзед. Адначасова войскі фронта, наступаючы па паўднёваму берагу Дуная, занялі населеныя пункты Дунасег, Кунсігет, Мошансентміклош, Бешаркані, Маглоца. У баях за 30 сакавіка яны ўзялі ў палон больш 800 салдат і афіцэраў праціўніка».**

Войскі 3-га Украінскага фронту, прадаўжаючы наступленне, у гэты дзень авалодалі гарадамі Вашвар, Керменд, Сентготард — важнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на рацэ Раба і на поўдні ад возера Балатон. На іншых участках фронту прадаўжаліся пошукі разведчыкаў і баі мясцовага значэння.




**• У тыле**

«...Мінула 9 месяцаў з часу вызвалення Мінска ад нямецкіх бандытаў. За гэты час у Мінску адноўлена некаторая жыллёвая плошча, пушчаны і працуюць дзесяткі прамысловых прадпрыемстваў, працуюць культурна-бытавыя ўстановы. Горад паступова апраўляецца ад цяжкіх ран, якія нанеслі яму нямецка-фашысцкія захопнікі», — паведамляла «Звязда».

Насельніцтва правяло значную работу, выконваючы рашэнне IX сесіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных «Аб аднаўленні горада Мінска і працоўным удзеле насельніцтва ў аднаўленні горада». Як паведамляў старшыня выканкама Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных К. Бударын, за час ад IX да X сесіі было апрацавана больш 800 тысяч чалавека-гадзін. Ён заклікаў узняць усё насельніцтва сталіцы на актыўную дапамогу ў адбудове горада. Партыйныя, савецкія, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі, вулічныя камітэты павінны былі неадкладна разгарнуць вялікую палітычную работу сярод працоўных, мабілізаваць усе сілы на агульнанародную будоўлю — на дасягнутым спыняцца не планавалі.




**«Шчырае жаданне людзей хутчэй адбудаваць і ўпарадкаваць сваю любімую сталіцу знайшло сваё выражэнне ў высокай прадукцыйнасці працы. У газету, напрыклад, пісала хатняя гаспадыня Ганна Якавенка, якая з ахвотай узялася за работу і адпрацоўвала на будаўніцтве, паводле яе слоў, не менш 67 гадзін у месяц, пачынаючы з таго часу, калі родны горад быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў: «Калі адчуваеш, што прыносіш карысць радзіме, што будуеш для шчасця свайго народа, для сябе, тады працуеш лёгка і радасна. Працавала я на аднаўленні моста праз раку Свіслач і на іншых аб'ектах. І радуецца маё сэрца цяпер, калі праходжу праз прыгожы, добра пабудаваны мост, бо тут закладзена і доля маёй працы», — распавядала жанчына».**

Муж Ганны быў забіты на фронце. Цяжка ўсвядоміць смерць блізкага чалавека, але жанчына, шануючы яго памяць, вырашыла працягваць займацца справамі: «Муж любіў свой горад і не хацеў бы бачыць яго ў руінах і папялішчах».

На яе плячах у 1945-м ляжала яшчэ выхаванне дваіх сірот — 8-гадовай Іны і 13-гадовага Ігара, бацькоў якіх забілі немцы. «Але я заўсёды знайду час, каб дакладна па графіку выйсці на работу на свой аб'ект», — сцвярджала жанчына.

«Да адбудовы роднага горада трэба было адносіцца па-гаспадарску: «Якая ж гаспадыня не прывядзе ў парадак свой дом, не будзе імкнуцца зрабіць яго прыгожым і ўтульным? Так будзем-жа лічыць, што разбураны ворагамі Мінск — гэта наш вялікі агульны дом. Навесці ў ім парадак — наш пачэсны абавязак», — пісала Ганна».

А наш з вамі абавязак — памятаць, колькі намаганняў нашых суайчыннікаў было ў свой час прыкладзена, каб родная сталіца зноў стала квітнеючай, утульнай і добраўпарадкаванай.

**Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.**

# 300 СТАРОНАК ПРА ВАЙНУ

## Пошукавікі апублікавалі новыя факты гітлераўскіх злачынстваў

«Магілёўскі пошукавы веснік» — унікальнае выданне, адзінае на постсавецкай прасторы. Яго васямнаццаты выпуск прысвечаны 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Пад абгорткай — вынікі пошукавых экспедыцый, архіўныя матэрыялы, артыкулы розных аўтараў: Мікалая Барысенкі, Людмілы Грышанавай, Аляксандра Халеева, Юрыя Абмоіна, Галіны Кажэўнікавай, Алы Казючыц і іншых. 300 старонак актуальнай інфармацыі.

### КАЗІМІРАЎСКІ ЛЕС

Узрушэннем мінулага года сталі раскопкі ў Казіміраўскім лесе, дзе акупанты хавалі сляды сваіх злачынстваў — забітых імі мірных савецкіх грамадзян. Гэтай тэме прысвяціў свой артыкул **кіраўнік Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» Мікалай БАРЫСЕНКА.** Прызнаецца, што збіраў факты па крупінках.

— Катастрафічна мала матэрыялу па гэтай тэме, — кажа ён. — Не толькі па Казіміраўскім лесе, дзе вяліся расстрэлы, але і па Старым Пашкаве, Палыкавічах. Тых, хто выжыў, засталося вельмі мала. А яны самыя галоўныя сведкі. Толькі па іх успамінах можна адносна аднавіць падзеі.

Напэўна, упершыню ў Магілёве даследчык сабраў найбольш поўны банк даных усіх рэпрэсіўных нямецкіх нацысцкіх арганізацый, якія прымалі ўдзел у знішчэнні мірных жыхароў. Улічваючы, што Магілёў быў тылавым раёнам групы армій «Цэнтр», за тры гады акупацыі тут перавярнуліся дзясяткі часцей, якія займаліся злачынствамі. Асноўным рэпрэсіўным органам, які спецыялізаваўся на знішчэнні мірных жыхароў, удзельнікаў супраціўлення, падпольшчыкаў, партызан — усіх, хто супрацьстаяў акупацыйнаму рэжыму, была айнзацкаманда 8 пад кіраўніцтвам Брэдфіша.

— Яна займалася аблавамі, удзельнічала ў блакадах партызан, — удакладняе Мікалай Барысенка. — Арыштоўвала і карала смерцю падпольшчыкаў, засылала сваіх агентаў у партызанскія атрады. Айнзацкаманда дзейнічала не толькі ў Магілёве, але і ў Магілёўскім, Клічаўскім, Асіповіцкім, Бабруйскім раёнах, на ўсходзе Магілёўшчыны — Чавускім, Слаўгарадскім, Быхаўскім раёнах. Усе самыя змрочныя старонкі акупацыі звязаны ў першую чаргу з ёй. Важна, што мы цяпер канкрэтна ведаем нацысцкае падраздзяленне, якое сыграла асноўную ролю ў знішчэнні дзясяткаў тысяч мірных жыхароў у Магілёўскай вобласці. Расстрэльвалі, спальвалі, забівалі ў «газвагенах» — душагубках, якія ўпершыню прымяняліся ў Магілёве пры знішчэнні псіхічна хворых людзей.

Пры адступленні гітлераўцы хавалі свае крывавыя сляды. Імі была распрацавана сакрэтная аперацыя «1005-Цэнтр». З ліку савецкіх грамадзян стварaліся так званыя каманды смертнікаў. Па загадзе немцаў яны эксгумавалі трупы і спальвалі іх. Прах развейвалі па палях, саджалі на месцы злачынстваў лес. Пасля ўдзельнікаў аперацыі знішчалі, каб не рассакрэцілі тайну.

### ЛЕС ПАВІНЕН СТАЦЬ МЕМАРЫЯЛЬНЫМ

Мікалай і Святлана Барысенкі рыхтуюць кнігу па генацыдзе ў Магілёўскай вобласці.

— У артыкуле нашага весніка трагедыя разгледжана толькі ў кантэксце Казіміраўскага лесу, — кажа ён. — Месца страшнае, па ім можна прасачыць усю гісторыю акупацыі Магілёва. Асноўную інфармацыю будзем чэрпаць з матэрыялаў працэсаў у Нюрнбергу, Мюнхене, Магілёве, Мінску з 1947 да 1970 года. Там дастаткова сведчанняў па злачынствах нацыстаў у Магілёве і вобласці.

Першая пошукавая экспедыцыя гэтага года клуба «Віккру» працягнецца ў Казіміраўскім лесе разам з 52-м пошукавым батальёнам Мінабароны. Сёлета на месцы трагедыі плануецца ўстанавіць фундаментальны помнік, а лесу надаць статус мемарыяльнага.

### СРОДАК СУПРАЦЬ БЯСПАМЯЦТВА

**Метадыст Магілёўскага абласнога цэнтра творчасці, начальнік штаба гісторыка-патрыятычнага клуба «Віккру» Святлана БАРЫСЕНКА** расказвае, што матэрыялы зборніка — гэта цалкам эксклюзіўная інфармацыя. Пра тых жа лётчыкаў, якія не вярнуліся з баявога задання. У гэтым кірунку добра спрацавала група «Крылы Перамогі» ў складзе Аляксандра Клёміна і Міхаіла Нялюбіна, якія ўстанавілі месцы падзення некалькіх самалётаў. Летась па ініцыятыве родных лётчыкаў і пры падтрымцы «Віккру» і фінансавай падтрымцы дзяржорганаў быў устаноўлены памятны знак 4 штурмавому авіяцыйнаму палку.




У зборніку дасканала прапрацавана тэма лагераў ваеннапалонных.

Мікалай Барысенка адзначае, што жывыя, напрацаваныя на мясцовасці, матэрыялы заўсёды даюць плён.

— Гэта самы эфектыўны сродак у барацьбе са скажэннямі гістарычнай праўды пра вайну, — кажа ён. — Нашы апаненты перапісваюць гісторыю таму, што яшчэ шмат невядомага, засакрэчанага, нявывучанага. Нам трэба развіваць мясцовую рэгіянальную гісторыю, краязнаўства.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.**

### У тэму

З мінулага года клуб «Віккру» вырабляе памятныя нагрудныя значкі па пошукавых экспедыцыях. Іх атрымлівае кожны ўдзельнік. У некаторых пошукавікаў за плячыма дзясяткі экспедыцый, іх калекцыі найбольш поўныя.

МЕРКАВАННЕ

# УКЛАДЫ З ГАРАНТЫЯЙ

## Беларусы больш давяраюць нацыянальнай валюце



**У лютым 2025 года прадоўжыўся рост зберажэнняў насельніцтва ў беларускіх рублях. Тэрміновыя дэпазіты фізічных асоб у рублях павялічыліся на 350,4 мільёна рублёў, склаўшы на 1 сакавіка 11,5 мільярда рублёў. Пра гэта сведчаць даныя, апублікаваныя на сайце Нацыянальнага банка. Гэта яўны знак таго, што беларусы давяраюць беларускаму рублю і вераць у стабільнасць нашай эканомікі.**

Праблема захавання назапашванняў актуальная для большасці беларусаў, якія хочуць не толькі застрахавацца ад інфляцыйных працэсаў, але і павысіць свой дабрабыт. Існуе адно няпісанае правіла: захоўвайце зберажэнні ў той валюце, у якой вы атрымліваеце даход і плануеце выдаткі. А паколькі большая частка нашых грамадзян атрымліваюць зарплату, пенсію і іншыя даплаты ў беларускіх рублях, лагічна ў іх і захоўваць свае назапашванні.

Галоўны плюс банкаўскіх укладаў у беларускіх рублях — не толькі больш высокая даходнасць у адносінах да альтэрнатыўных інструментаў, але і іх стабільнасць і бяспека. Усе ўклады ў беларускіх банках, якія з'яўляюцца членамі нацыянальнай сістэмы гарантавання ўкладаў, абаронены дзяржавай. У выпадку банкрутства банка ўкладчык атрымлівае свае грошы назад у поўным памеры. У Беларусі ніводны іншы фінансавы інструмент (акцыі, аблігацыі і інш.) не мае такой высокай ступені абароны.

**Даведка. У адпаведнасці з арт. 180 Банкаўскага кодэкса грашовыя сродкі насельніцтва могуць прымацца банкамі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі, якія маюць ліцэнзію на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці, што выдаецца банку пры ўмове яго ўстойлівага фінансавага становішча. Апошняе з'яўляецца адной з гарантый стапрацэнтнай захаванасці і вяртання зберажэнняў насельніцтва.**

Нялішнім будзе нагадаць і аб асаблівасцях падаткаабкладання працэнтнага даходу па банкаўскіх укладах. Згодна з п. 36 арт. 208 Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь, вызваляюцца ад падаходнага падатку з фізічных асоб у ліку іншых пералічаных даходы, атрыманыя ў выглядзе працэнтаў па банкаўскіх укладах (дэпазітах), грашовых сродках, якія знаходзяцца на бягучым банкаўскім рахунку ў банках, за выключэннем банкаўскіх рахункаў, якія выкарыстоўваюцца плацельшчыкамі пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай дзейнасці.

У мінулым месяцы на пашыраным пасяджэнні праўлення Нацыянальнага банка, дзе падвялі вынікі 2024-га і разглядалі планы на бягучы год, былі адзначаны пазітыўныя тэндэнцыі на рынку ўкладаў (дэпазітаў) фізічных асоб і ў сферы спажывецкага крэдытавання ў Беларусі. Так, тэрміновыя і ўмоўныя дэпазіты ў нацыянальнай валюце прыраслі за мінулы год на 37 %, што істотна вышэй за прагноз (20—24 %). Пры гэтым самымі папулярнымі ў насельніцтва былі доўгатэрміновыя безадзыўныя ўклады. На іх прыпала звыш 90 % усяго аб'ёму доўгатэрміновых рублёвых дэпазітаў фізічных асоб.

Была адзначана яшчэ адна асаблівасць у ашчаднай актыўнасці беларускіх укладчыкаў. Долі ўкладаў у беларускіх рублях сталі прыкметна расці яшчэ з пачатку мінулага года, у той час як уклады ў замежнай валюце, наадварот, знізіліся. Згодна з прагнозам, у 2025 годзе тэрміновыя і ўмоўныя ўклады ў нацыянальнай валюце павінны павялічыцца тэрмінам на адзін год і больш павялічацца яшчэ на 17—22 %. Росту рублёвых дэпазітаў будзе садзейнічаць палітыка Нацбанка, які арыентуе камерцыйныя банкі на захаванне леташняга трэнду на прывабнасць працэнтных ставак па новых доўгатэрміновых безадзыўных укладах фізічных асоб у нацыянальнай валюце. Калі ў снежні 2024 года беларускія банкі прапаноўвалі працэнтныя стаўкі па доўгатэрміновых укладах грамадзян у сярэднім 13,5 % гадавых у беларускіх рублях, то ў лютым 2025-га дадзеная велічыня склала 14,6 % гадавых.

Што датычыцца альтэрнатыўных спосабаў укладання асабістых сродкаў, можна адзначыць наступнае.

Адносна канвертацыі беларускіх рублёў у замежныя валюты з наступным яе захоўваннем «пад падушкай» варта ўлічваць, што долар, як, зрэшты, і іншыя замежныя валюты, таксама схільны да інфляцыі. А іх спантанная купля ці продаж, адпаведна ў перыяд росту ці падзення, як правіла, прыводзіць да значных страт.

Для беларусаў застаецца адкрытым рынак акцый, аблігацый, токенаў, крыптавалюты, каштоўных металаў і інш. Аднак у гэтым класе актываў трэба быць вельмі акуратнымі, паколькі можна страціць усе грошы, бо гэта не банкаўскі дэпазіт са стапрацэнтнай гарантыяй захаванасці грошай.

Асобнага каментарыя патрабуе ацэнка ўкладанняў у расійскія дэпазіты, якія на першы погляд могуць скласці канкурэнцыю аналагічным беларускім укладанням. Напрыклад, у Расіі працэнтныя стаўкі на бягучы момант істотна вышэйшыя, можна нават знайсці варыянты з 18—22 % гадавых. Але пры прыняцці такога рашэння, асабліва для тых, хто жыве ў Беларусі і траціць грошы ўнутры краіны, неабходна ўлічваць значныя транзакцыйныя выдаткі і прагнозныя ацэнкі на стаўку рэфінансавання расійскага Цэнтрабанка.

Інвестыцыі ў сваю адукацыю. «Калі высыпаць змесціва кашалька сабе ў галаву, то яго ўжо ніхто ў вас не адбярэ» — гэта фраза Бенджаміна Франкліна застаецца актуальнай і сёння. З новымі ведамі вы атрымліваеце не толькі канкурэнтныя перавагі, але і ўпэўненасць ва ўласнай будучыні. Інвестыцыі ў сваю адукацыю — адзіны спосаб, куды можна ўкласці грошы з мінімальнай рызыкай.

Калі ёсць свабодныя сродкі, атрыманыя веды і вопыт, ідэя адкрыць уласную справу прыходзіць сама сабой. Але тут галоўнае, каб бізнес-праект быў не толькі цікавы, але і знаёмы асабіста вам. Не варта «капіраваць», як вам здаецца, больш паспяховых сваіх знаёмых і нават сваякоў. Вы павінны разумець, што прадпрымальніцтва як від дзейнасці — гэта высокарызыкоўныя інвестыцыі. Нялішнім тут будзе прыцягненне спецыяльнага бізнес-кансультанта.

Не трэба забываць і пра тое, што асаблівую актуальнасць і адказнасць выбар уласнага інструментарыю па захаванні (прымнажэнні) сваіх накапленняў набывае на сямейным узроўні. Тут заложнікамі вашых непрадуманых дзеянняў па чаканні хуткага ўзбагачэння могуць стаць блізкія, уключаючы непаўналетніх дзяцей. У гэтым выпадку нялішнім будзе падумаць пра складанне для канкрэтнай сям'і спецыяльнага плана дзеянняў па дасягненні жаданых фінансавых мэт, г. зн. сямейнага бюджэту з элементамі рызыка-менеджменту.

Такім чынам, можна зрабіць наступную выснову: невялікую суму наяўных можна і трэба мець для забеспячэння бягучай фінансавай бяспекі і/або непрадбачаных выдаткаў. А ўсе астатнія грошы лепш трымаць у фінансавых інструментах, якія забяспечваюць не толькі захаванасць, але і, пажадана, даходнасць з улікам інфляцыйных працэсаў. На дадзены момант гэта банкаўскія ўклады ў беларускіх рублях. Аднак і тут важна памятаць, што любыя фінансавыя рашэнні павінны быць узважанымі і ўлічваць індывідуальныя абставіны і мэты.

**Георгій ГРЫЦ,**
**кандыдат эканамічных навук.**


### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА 15.04.2025 г. в 11.00

по адресу: 230005, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. № 204,
по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на **пять лет** для производственных целей (за исключением вредных производств), складских помещений, оказания услуг.
Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Гродненского филиала, 230005, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87.

| Адрес арендуемого имущества | № Лота | Площадь, кв. м | Коэффициент от 0,5 до 3,0 | Начальная цена продажи, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. | Характеристика |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Капитальное строение, автоматическая телефонная станция – 5, 1-й этаж, помещения в т. ч. вспомогательное помещение (коридор). Гродненская обл., г. Гродно, ул. Репина, 38 | 1 | 189,5, в т. ч.: 181,8; 5,4; 2,3 | 1,5 | 841,38 | 841,38 | Помещения находятся на первом этаже двухэтажного железобетонного здания. В помещении имеются естественное освещение, отопление, электроснабжение. В здании имеется автономное отопление, водоснабжение, канализация, телефонизация. Здание находится на расстоянии 4,8 км от автовокзала. К зданию организованы удобные подъездные пути. Площади находятся в удовлетворительном состоянии, не используются с ноября 2024 г. |
| Изолированное помещение, помещение связи, 5-й этаж, помещение. Гродненская обл., г. Гродно, ул. Пестрака, 36-11 | 2 | 35,9 | 1,5 | 159,40 | 159,40 | Помещение находится на пятом этаже пятиэтажного кирпичного здания. В здании имеются электроснабжение, отопление, водоснабжение, канализация, телефонизация. Здание находится на расстоянии 4,1 км от автовокзала. К зданию организованы удобные подъездные пути. Помещение находится в удовлетворительном состоянии, не используется с ноября 2024 года |
| Изолированное помещение, помещение связи, 5-й этаж, помещение. Гродненская обл., г. Гродно, ул. Пестрака, 36-11 | 3 | 26,9 | 1,5 | 119,44 | 119,44 | Помещение находится на пятом этаже пятиэтажного кирпичного здания. В здании имеются электроснабжение, отопление, водоснабжение, канализация, телефонизация. Здание находится на расстоянии 4,1 км от автовокзала. К зданию организованы удобные подъездные пути. Помещение находится в удовлетворительном состоянии, не используется с ноября 2024 года |
| Изолированное помещение, помещение связи, 2-й этаж, помещение. Гродненская обл., г. Гродно, ул. Пестрака, 36 пом. 7 | 4 | 16,2 | 1,5 | 71,93 | 71,93 | Помещение находится на втором этаже пятиэтажного кирпичного здания. В здании имеются электроснабжение, отопление, водоснабжение, канализация, телефонизация. Здание находится на расстоянии 4,1 км от автовокзала. К зданию организованы удобные подъездные пути. Помещение находится в удовлетворительном состоянии, не используется с ноября 2024 года |

Порядок проведения и оформления участия в аукционе определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049(в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 №16, от 12.07.2013 № 607).

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, предоставившие организатору следующие документы: представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность, заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с документами, порядком проведения аукциона, соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заверенную банком копию платежного документа, о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона, документ, удостоверяющий личность (для физических лиц, для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) (для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц резидентов Республики Беларусь), легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения (для юридических лиц нерезидентов Республики Беларусь). Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

*Задаток перечисляется на субсчет BY16AKBB30120000400714000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, БИК AKBB BY2X, Гродненский филиал РУП «Белтелеком».*

Участники аукциона уплачивают штраф в случаях, предусмотренных частью второй пункта 14 Положения о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607), в размере 15 % от начальной цены продажи соответствующего лота.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

**Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу: 230005, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. 407, с 02.04.2025 по 14.04.2025 г. включительно в рабочие дни (с 09.00 до 16.00). Документы, поданные после 16.00 14.04.2025 г., не рассматриваются.**

**Телефоны для справок:**
**(0152) 606805, (0152) 555138, факс (0152) 555139**

АКТУАЛЬНА

# ЛІЧБЫ Ў ВІРТУАЛЬНЫМ КАШАЛЬКУ

## Беларусь адной з першых у свеце прызнала законнай работу з крыптавалютамі

**Тэрміны «крыптавалюта», «біткоін», «майнінг» увайшлі ў актыўны лексічны запас многіх нашых сучаснікаў. Адвакат Мінскай абласной калегіі адвакатаў Алена ГРОНСКАЯ дапамагае разабрацца, якія законы рэгулююць крыптавалютны рынак Рэспублікі Беларусь, што дазволена і што забаронена.**



— Наша краіна адной з першых у свеце прызнала законнай работу з крыптавалютамі, — кажа адвакат. — Беларусь з'яўляецца адной з краін, дзе крыптавалюты рэгулююцца на дзяржаўным узроўні, што дае фізічным і юрыдычным асобам легальныя механізмы работы з лічбавымі актывамі. Беларусы могуць купляць, абменьваць, майніць «крыпту», а таксама дарыць і завяшчаць. Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 21.12.2017 г. № 8 «Аб развіцці лічбавай эканомікі» стаў сапраўды рэвалюцыйным: дзякуючы яму ўзаконіліся крыптавалюта, майнінг і абарот токенаў.

17 верасня 2024 года Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў Указ № 367 «Аб звароце лічбавых знакаў (токенаў)», які забараняе куплю і продаж крыптавалюты па-за беларускімі крыптабіржамі і абменнікамі. Гэта рашэнне накіравана на стварэнне празрыстага і кантралявальнага асяроддзя для аперацый з лічбавымі актывамі і прадухіленне незаконных дзеянняў, звязаных з крыптавалютамі, кажа Алена Гронская:

— Асноўнай мэтай указа з'яўляецца ўзмацненне абароны грамадзян і зніжэнне рызык, звязаных з махлярствам і вывадам сродкаў за межы краіны праз крыптавалютныя платформы. Ва ўказе падкрэсліваецца, што любыя аперацыі з лічбавымі знакамі (токенамі), уключаючы крыптавалюты, павінны ажыццяўляцца выключна праз зарэгістраваныя ў Беларусі крыптабіржы і крыптаабменнікі.

### МОЖНА ДАРЫЦЬ, МОЖНА ЗАВЯШЧАЦЬ

Крыптавалюта — не электронныя грошы, якія з'яўляюцца толькі формай грошай фізічных. Гэта прынцыпова іншая з'ява, адзначае эксперт. У адрозненне ад традыцыйных валют крыптавалюта не выпускаецца дзяржаўнымі банкамі і не падкантрольная фінансавым рэгулятарам. Крыптавалюта — разнавіднасць лічбавых грошай, якая выкарыстоўваецца ў міжнародным абароце ў якасці ўніверсальнага сродку абмену, тлумачыць адвакат. Яе можна набыць на крыптавалютнай біржы — за рублі ці іншую валюту. Або майніць (гэта значыць здабываць) у супольнасці з іншымі майнерамі.

Крыптавалют існуе больш за паўтары тысячы. Найбольш папулярны біткоін: пра яго чулі ўсе. Таксама існуюць токены — адзінкі ўліку, якія з'яўляюцца «заменнікамі каштоўных папер» у лічбавым свеце.

> **— Адзначу, што крыптавалюта мае некаторыя рысы наяўных грошай і, адпаведна, характарызуецца аналагічнымі рызыкамі: можа быць выкарыстана ў самых розных мэтах, у тым ліку нелегальных, — адзначае адвакат.**

— Алена, якія дзеянні з «крыптой» дазволеныя фізічным асобам у Беларусі?

— У адпаведнасці з Дэкрэтам № 8 фізічныя асобы маюць права валодаць лічбавымі знакамі (токенамі, крыптавалютай). Фізічныя асобы маюць права здзяйсняць наступныя аперацыі: майнінг крыптавалют, захоўванне крыптавалюты ў віртуальных кашальках, абмен лічбавых знакаў (токенаў, крыптавалюты) на іншыя лічбавыя знакі (токены, крыптавалюты), набыццё лічбавых знакаў, іх адчужэнне за беларускія рублі, замежную валюту, электронныя грошы, дарэнне і завяшчанне лічбавых знакаў. У адпаведнасці з п. 2.2 арт. 2 Дэкрэта № 8 усе гэтыя аперацыі, калі яны праводзяцца фізічнымі асобамі самастойна, без прыцягнення іншых асоб, не з'яўляюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю. Токены не падлягаюць



дэкларыванню. Асобна варта адзначыць, што пералік аперацый, дазволеных для фізічных асоб, з'яўляецца вычарпальным. Гэта значыць, здзяйсненне любых іншых аперацый з лічбавымі знакамі на тэрыторыі Беларусі супярэчыць дзейнаму заканадаўству. Фізічныя асобы пры куплі-продажы лічбавых актываў дзейнічаюць праз афіцыйна зарэгістраваных прафесійных удзельнікаў.

— Хто такія «прафесійныя ўдзельнікі» і якія іх функцыі?

— Парк высокіх тэхналогій (ПВТ) — арганізацыя, якая мае асаблівыя дазволы на правядзенне аперацый з лічбавымі актывамі, а таксама права тлумачыць тэхнічныя і іншыя практычныя аспекты абыходжання з крыптавалютамі. Прафесійныя ўдзельнікі — гэта, напрыклад, крыптабіржа (мае права аказваць паслугі па куплі-продажы і абмене токенаў паміж карыстальнікамі ад свайго імя, арганізоўваць таргі токенаў) або крыптаабменнік, крыптаброкер (здзяйсняе здзелкі з лічбавымі актывамі ад імя кліентаў праз крыптабіржы і дае кансультацыі) і г. д. Магчымыя і іншыя віды дзейнасці з выкарыстаннем токенаў, ухваленыя наглядальным саветам ПВТ.

— Ці ёсць абмежаванні для фізічных асоб у аперацыях з крыптавалютай за межамі Беларусі?

— Дзейнае заканадаўства не абмяжоўвае фізічных асоб у аперацыях з токенамі за межамі краіны. Магчыма выкарыстоўваць крыптавалюты ў якасці сродкаў плацяжу за мяжой, калі гэта дазволена законамі краіны.

### МАЙНІЦЬ — ТОЛЬКІ ДЛЯ СЯБЕ

— Ці можна сёння ў Беларусі атрымліваць заработную плату ў крыптавалюце або разлічвацца ёю? Увогуле часта нельга рабіць з крыптавалютай у нашай краіне?

— Дзейнае заканадаўства Рэспублікі Беларусь не ўтрымлівае звестак аб тым, што крыптавалюты і токены з'яўляюцца сродкамі плацяжу. Гэта азначае, што разлікі ў іх не дапускаюцца. Адзіным законным плацежным сродкам на тэрыторыі нашай краіны з'яўляецца беларускі рубель (у асобных выпадках дазваляецца выкарыстанне замежнай валюты). Акрамя таго, у Беларусі крыптавалюта не можа выступаць у якасці плацежнага сродку, а аплата тавараў (паслуг, работ) крыптавалютай з'яўляецца незаконнай. Майнінг крыптавалют можна рабіць толькі для сябе, любая пасрэдніцкая дзейнасць з'яўляецца незаконнай. Заканадаўства забараняе фізічным асобам аказваць якія-небудзь паслугі, звязаныя з крыптавалютамі і токенамі, ад імя або па даручэнні іншых асоб (у тым ліку сваякоў).

— Якая прадугледжана адказнасць за незаконную дзейнасць, звязаную з крыптавалютай?

— Незаконная дзейнасць, звязаная з крыптавалютай, можа пацягнуць за сабой прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці, паводле ч. 3 арт. 13.3 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях (незаконная прадпрымальніцкая дзейнасць). Гэта цягне накладанне штрафу ў памеры ад 20 да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй да 100 % сумы даходу, атрыманага ў выніку такой дзейнасці, прылад і сродкаў здзяйснення адміністрацыйнага правапарушэння або без канфіскацыі, на індывідуальнага прадпрымальніка — ад 20 да 200 базавых велічынь з канфіскацыяй да 100 % сумы даходу, атрыманага ў выніку такой дзейнасці, прылад і сродкаў здзяйснення адміністрацыйнага правапарушэння або без канфіскацыі, а на юрыдычную — да 500 базавых велічынь з канфіскацыяй да 100 % сумы даходу, атрыманага ў выніку такой дзейнасці, прылад і сродкаў здзяйснення адміністрацыйнага правапарушэння або без канфіскацыі. Пры абмене крыптавалюты на звычайныя грошы, магчыма, спатрэбіцца тлумачыць крыніцу паходжання сродкаў. Рэгулярны абмен наяўных на «крыпту» можа быць расцэнены як незаконная прадпрымальніцкая дзейнасць.

— Вы казалі пра магчымасць дарэння і атрымання ў спадчыну крыптавалют...

> **— Лічбавыя актывы пераходзяць да наступных уладальнікаў гэтак жа, як і іншыя віды маёмасці. Але пакуль што практыка ў гэтай галіне знаходзіцца ў стадыі фарміравання.**

А ў цэлым лічбавыя грошы можна набываць і захоўваць у чаканні росту цаны, а таксама зарабляць на абмене адных лічбавых актываў на іншыя, але нельга, паўтаруся, выкарыстоўваць для плацяжоў на тэрыторыі Беларусі. Здзяйсняючы якія-небудзь дзеянні ў віртуальнай прасторы з крыптавалютай, неабходна пераканацца ў іх легальнасці. Асобам, якія працуюць з лічбавымі актывамі, важна сачыць за актуальнымі зменамі заканадаўства і пры неабходнасці кансультавацца са спецыялістамі для мінімізацыі рызык.

**Дзіяна РОНІНА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение «Минскстрой»**

**доводит до сведения заинтересованных лиц информацию**

**О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ И ДОПОЛНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ**

***(опубликована в газете «Звязда» от 17.01.2025 № 10 (30398)***

**о строительстве жилых (нежилых) помещений по объекту строительства «Жилая застройка в районе пересечения ул. Захарова и ул. Андреевской». 2-я очередь строительства. Жилой дом № 1 по г/п**

**Объект долевого строительства – жилое помещение (квартира), встроенно-пристроенное помещение торгового назначения.**

Для категории граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров создания объектов долевого строительства на дату опубликования декларации по объекту предлагается **28 (двадцать восемь)** жилых помещений (квартир), в том числе:

**- 14 (четырнадцать) двухкомнатных квартир:**

- № 22, № 23, № 26, № 27, № 30, № 31, № 38, № 39, № 42, № 43, № 50, № 51, № 54, № 55 (общая площадь 64,14 кв. м каждая);

**- 14 (четырнадцать) трехкомнатных квартир:**

- № 21, № 25, № 29, № 37, № 41, № 49, № 53 (общая площадь 92,44 кв. м каждая);

- № 24, № 28, № 32, № 40, № 44, № 52, № 56 (общая площадь 91,62 кв. м каждая).

**Цены на объекты долевого строительства:**

Стоимость строительства 1 квадратного метра общей площади объектов долевого строительства без выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет:

| Номер квартиры | Этаж | Количество комнат | Площадь жилого помещения (квартиры), $м^2$ | Стоимость 1 $м^2$ при 100 % оплате, бел. руб. | Стоимость 1 $м^2$ при условии кредитования в рамках партнерских кредитных программ*, при оплате по графику платежей бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 22, 23, 26, 27, 30, 31 | 7–9 | 2 | 64,14 | 6 800,00 | 7 083,00 |
| 38, 39, 42, 43 | 11, 12 | 2 | 64,14 | 7 000,00 | 7 292,00 |
| 50, 51, 54, 55 | 14,15 | 2 | 64,14 | 7 200,00 | 7 500,00 |
| 21, 24, 25, 28, 29, 32 | 7–9 | 3 | 91,62; 92,44 | 6 600,00 | 6 875,00 |
| 37, 40, 41, 44, 49, 52, 53, 56 | 11, 12, 14, 15 | 3 | 91,62; 92,44 | 6 800,00 | 7 083,00 |

*Банками-партнерами являются ОАО «АСБ Беларусбанк», ОАО «Белинвестбанк».

**Заявления** о заключении договоров будут приниматься (регистрироваться) в порядке очереди через 5 календарных дней после публикации настоящих изменений и дополнений в проектную декларацию в порядке очереди по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105. Договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться через 7 (семь) календарных дней после опубликования настоящей декларации по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105, с физическими и юридическими лицами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

**Для подачи заявления и заключения договора необходимо наличие:**

для физических лиц – паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность), доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке;

для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – документа, подтверждающего полномочия представителя, паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность) представителя, копии свидетельства о государственной регистрации и Устава.

Если физическое лицо либо представитель юридического лица не явилось(ся) на участие в долевом строительстве с момента регистрации его заявления в течение 3-х рабочих дней для заключения договора и письменно не сообщил(о) об уважительных причинах своей неявки в Viber, Telegram, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другими лицами.

Условия декларации, не измененные (не исключенные) настоящим извещением, остаются неизмененными.

Подробные сведения об объекте строительства, планировках квартир и ходе строительства можно получить в отделе реализации объектов недвижимости и жилья по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105, по тел. моб. +375 29 195 18 21 либо на сайтах: https://minskstroy.by, www. https://andreevskiy.by

УНП 100071325

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Ч.002.00076** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** ОАО «Знамя индустриализации», 210017, Республика Беларусь, г. Витебск, ул. Гагарина, 11.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, **https://etpvit.by**

**Дата и время проведения торгов: 26.04.2025 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-163202, площадью 217,8 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 11Г-10, назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – нежилое помещение подвала. Примечания: Нежилое помещение подвала. Крыльца бетонные – 17 кв. м. Места общего пользования – тамбур – 6,5 кв. м, лестничные клетки – 19,2 кв. м, 17,8 кв. м, 23,0 кв. м, 17,3 кв. м, 19,7 кв. м, 17,1 кв. м, 19,7 кв. м, 16,9 кв. м, 19,4 кв. м, коридоры – 22,5 кв. м, 16,8 кв. м, машинное отделение – 116,8 кв. м, мастерская лифтеров – 15,3 кв. м. Объем мест общего пользования – 1179 куб. м.

Обременение: договор аренды сроком по 31.03.2026.
Запрещение регистрационных действий.
Лифт грузовой ПГ-288 инв № Э 2988, грузоподъемностью 1000 кг.

**Нач. цена: 75 982,73 бел. руб. без учета НДС. Без снижения. Задаток: 7598,27 бел. руб.**

Электронные торги проводятся в соответствии Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» etpvit.by

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами:** до 16.00 25.04.2025.

**Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия электронных торгов:** Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, расходы Продавца на проведение оценки предмета эл. торгов, оплатить услуги Оператора ЭТП; заключить договор купли-продажи в течение 10 календарных дней со дня проведения электронных торгов; оплатить предмет эл. торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи; оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета электронных торгов. Расходы Продавца на проведение независимой оценки составляют 676,51 бел. руб. с НДС.

Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения.

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе «Недвижимое имущество».

Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375445928209, Светлана Георгиевна.



**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении повторного общего собрания акционеров**
**ОАО «Белбуд»** (далее – Общество)

Сообщаем Вам, что годовое общее (очередное) собрание акционеров открытого акционерного общества «Белбуд» (далее – Общество) будет проводиться повторно на основании п 6.10. Устава в очной форме **08.04.2025 в 15.00** по адресу местонахождения Общества: **220113, г. Минск, ул. Восточная, 133, офис 1.**

Дата, время и место проведения собрания: **08.04.2025 в 15.00** (г. Минск, ул. Восточная, 133, офис 1, кабинет 101).

**Повестка дня:**

1. Об утверждении годового отчета Общества за 2024 год.
2. Об утверждении годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2024 год.
3. О рассмотрении аудиторского заключения по результатам аудита годовой бухгалтерской отчетности за 2024 год.
4. О распределении убытков по итогам работы Общества за 2024 год.
5. О совершении крупной сделки.
6. О изменении состава Наблюдательного совета.
7. О внесении изменений в Устав

Органом, созывающим годовое общее собрание акционеров, согласно п. 6.4 Устава Общества, является наблюдательный совет Общества.

Повторное общее собрание акционеров созывается в соответствии с п. 6.10. Устава и решением общего собрания от 28.03.2025 (протокол № б/н).

Порядок ознакомления лиц, имеющих право на участие в собрании: начиная с 08.04.2025 (понедельник – четверг – с 08.30 до 16.00 (обед с 13.00 до 13.20)) по адресу: г. Минск, ул. Восточная, 133, офис № 1 (в приемной генерального директора), а в день проведения Собрания – по месту его проведения.

Место и время начала регистрации участников собрания: с 14.30 до 14.50 в день и по месту проведения собрания.

Участники годового общего собрания акционеров ОАО «Белбуд» обязаны при регистрации предъявить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность (представители акционеров – паспорт и доверенность).

УНП 100794022


# УТАЙМАВАЦЬ ДРОН

## Выхаванцы Спецыялізаванага ліцэя МУС асвойваюць беспілотнікі



**Беспілотныя лятальныя апараты сталі неад'емнай часткай нашага жыцця. Іх эфектыўнасць у розных сферах відавочная. У органах унутраных спраў беспілотнікі актыўна выкарыстоўваюцца пры затрыманні злачынцаў, фіксацыі парушэнняў Правілаў дарожнага руху, пошуку людзей, кантролі за абстаноўкай на вуліцах, пры выкананні спецыяльных задач. Навучанню кіраваць дронамі ўдзяляецца асаблівая ўвага: чым раней міліцыянер авалодае гэтымі каштоўнымі навыкамі, тым больш аператыўна і паспяхова ён будзе вырашаць задачы па забеспячэнні правапарадку, гарантаванні бяспекі грамадзян.**

Не адстаюць ад найноўшых тэндэнцый і ў Спецыялізаваным ліцэі МУС. Пачынаючы з трэцяй чвэрці навучальнага года выхаванцы асвойваюць асновы кіравання беспілотнымі лятальнымі апаратамі. Для гэтага створаны ўсе ўмовы: закуплена патрэбнае абсталяванне і, вядома, самі беспілотнікі, на камп'ютарах устаноўлена праграмнае забеспячэнне.

Аднак перш чым кіраваць гэтымі «жалезнымі птушкамі», хлопцы павінны прайсці сур'ёзную тэарэтычную падрыхтоўку і «адлятаць» патрэбную колькасць гадзін на сімулятарах. Карэспандэнты «Звязды» наведалі Спецыялізаваны ліцэй МУС і паназіралі за ўнікальным навучальным працэсам.

### КАРТА ПАЛЁТУ

Як паведаміў **начальнік Спецыялізаванага ліцэя МУС палкоўнік міліцыі Яўген АБРАМОВІЧ**, ініцыятыва аб навучанні кіраванню беспілотнымі лятальнымі апаратамі выхаванцаў нашай навучальнай установы сыходзіла ад міністра ўнутраных спраў. «Флагманам у гэтым кірунку з'яўляецца Акадэмія МУС: на базе ВНУ дзейнічаюць курсы павышэння кваліфікацыі, на якіх супрацоўнікі адтачваюць навыкі кіравання беспілотнымі лятальнымі апаратамі, — адзначыў ён. — Мы таксама скарысталіся дапамогай нашых шэфаў. Некалькі супрацоўнікаў прайшлі падрыхтоўку ў акадэміі. Выкладчыкі кафедры тактыка-спецыяльнай падрыхтоўкі Акадэміі МУС, у сваю чаргу, прыязджалі да нас і праводзілі з выхаванцамі першыя заняткі. Пазнаёмілі хлопцаў з відамі беспілотнікаў, расказалі, з якімі мэтамі яны выкарыстоўваюцца. Асобна спыніліся на заканадаўчай базе, якая рэгулюе выкарыстанне беспілотных лятальных апаратаў у нашай краіне».

З дазволу МУС Спецыялізаваны ліцэй закупіў два беспілотнікі, якія выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе. Аднак перш чым прыступіць да практычных заняткаў, юнакі павінны навучыцца кіраваць імі на сімулятары, што яны і робяць. Каб максімальна наблізіць працэс да рэальнасці, закуплены пульты кіравання ад рэальных FPV-дронаў, якія падключаюцца да сімулятараў беспілотных лятальных апаратаў. Пасля таго як налёт складзе не менш за 50 гадзін, выхаванец будзе дапушчаны да кіравання рэальным дронам.

Для таго каб ісці да мэты было цікавей, распрацавалі карткі палётаў. Кожная гадзіна, праведзеная за сімулятарам, фіксуецца. «Найперш задача выхаванцаў ліцэя — навучыцца ўтрымліваць FPV-дрон, — расказвае **начальнік аддзялення тэхнічных сродкаў навучання Спецыялізаванага ліцэя МУС падпалкоўнік міліцыі Дзмітрый ПАПРУГА**. — У адрозненне ад звычайнага беспілотніка, калі адпусціць джойсцік, FPV-дрон упадзе і разаб'ецца. А таму трэба ўмець яго ўтрымліваць, упэўнена кіраваць ім. Прычым не проста лятаць, а паралельна выконваць пэўнае заданне. Гэта як на аўтамабілі: умець руліць можа кожны, але рабіць гэта ўпэўнена, мэтанакіравана атрымліваецца не ўва ўсіх».

Падагравоаюць інтарэс да беспілотнікаў і заняткі з супрацоўнікамі спецыяльных падраздзяленняў, якія рэгулярна праводзяцца на базе ліцэя. Рашэннем міністра супрацоўнікі атрада міліцыі асаблівага прызначэння і спецыяльнага падраздзялення па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз» замацаваны за кожным курсам. Не так даўно яны прадставілі выхаванцам навінкі беспілотных лятальных апаратаў, на практыцы прадэманстравалі іх магчымасці.

«Выкарыстоўваем і вопыт Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка, — звяртае ўвагу Яўген Абрамовіч. — Паміж тэхнапаркам і ліцэем заключаны дагавор аб супрацоўніцтве. Пачынаючы з мінулага года нашы выхаванцы паспяхова праходзяць там навучанне. Адзін з кірункаў — кіраванне беспілотнымі лятальнымі апаратамі».

У перспектыве Спецыялізаваны ліцэй МУС і Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк плануюць рэалізаваць сумесны праект, звязаны са стварэннем беспілотнікаў з надрукаваных на 3D-прынтары дэталяў.

### НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Занятак, на якім будучыя вартавыя правапарадку асвойваюць беспілотнікі, з'яўляецца дадатковым і неабавязковым для наведвання. Аднак тых, хто б не жадаў навучыцца кіраваць дронамі, у ліцэі няма. Дзеці з цікавасцю ўспрынялі новую дысцыпліну і з задавальненнем наведваюць заняткі. Расклад распрацаваны такім чынам, каб у кожнага выхаванца ліцэя хаця б раз на тыдзень атрымлівалася пазаймацца на сімулятары.

Выхаванец 1 курса Ягор Шостак расказаў, што з радасцю ўспрыняў прапанову асвоіць асновы кіравання беспілотнымі лятальнымі апаратамі. «Гэта не толькі магчымасць правесці цікава час, але і даведацца нешта новае», — кажа ён.

Ягор прызнаецца: навучыцца ўтрымліваць дрон атрымлівалася не адразу. «Гэта не так проста, як здаецца на першы погляд, — заўважае юнак. — Але не варта спыняцца на паўшляху. Умець кіраваць беспілотнікам павінен кожны міліцыянер: такі навык значна спрашчае задачу па пошуку злачынстваў, пры выкананні іншых задач». Ягор марыць паступаць у ВНУ сілавога профілю, а таму перакананы, што атрыманыя падчас заняткаў веды дакладна не будуць дарэмнымі.

Такога меркавання прытрымліваецца і выхаванец 1 курса Макар Янкелайць. Ён захоплена вывучае характарыстыкі ўсіх дронаў, выбірае падчас работы на сімулятары розныя карты для палёту, каб паспрабаваць магчымасці беспілотных лятальных апаратаў у любых умовах. Макар лічыць, што лепш цяпер удзяліць увагу вывучэнню дронаў, чым потым, ужо падчас выканання рэальнай задачы.

Па словах Дзмітрыя Папругі, дзеці схопліваюць інфармацыю вельмі хутка. «А калі пачынае нешта атрымлівацца, ім становіцца яшчэ больш цікава, — заўважае ён. — Выхаванцы хутка вучацца. Часам нам, дарослым, за імі не ўгнацца. У планах — набыццё яшчэ некалькіх дронаў, каб у перспектыве арганізоўваць паміж ліцэістамі спаборніцтвы».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**





# МЕНКА, ПАЧАТАК

**Праца над канцэпцыяй археалагічнага музея пад адкрытым небам блізіцца да завяршэння**

Самыя маштабныя раскопкі за перыяд незалежнасці Рэспублікі Беларусь — на рацэ Менцы. Удзел у іх бралі сотні студэнтаў з 17 ВНУ краіны. А статус археалагічнага комплексу на рацэ Менцы змяніўся з трэцяй катэгорыі (у якую ўваходзяць помнікі мясцовага значэння) да другой — цяпер гэта помнік рэспубліканскага значэння. Пра ход даследчых і рэстаўрацыйных работ на гэтым аб'екце расказаў Аляксей АЎЛАСОВІЧ, загадчык цэнтра археалогіі Беларусі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

— Адным з найважнейшых аб'ектаў даследавання для археолагаў у 2023, 2024 і 2025 гадах з'яўляецца археалагічны комплекс на рацэ Менцы. Пільная ўвага да яго прыцягнута з верасня 2022 года, калі Раман Галоўчанка, на той момант прэм'ер-міністр Беларусі, наведаў Менку. Яго зацікавілі знаходкі нашых калег-археолагаў, а вялікі рэзананс выклікала выяўленае тут донца князя Ізяслава, старэйшага сына Рагнеды і князя Уладзіміра. Пасля было даручэнне на правядзенне археалагічных даследаванняў, якое мы паспяхова выканалі. Яно павінна было даць штуршок стварэнню археалагічнага музея пад адкрытым небам — Інстытут гісторыі НАН распрацаваў яго канцэпцыю. Цяпер яна ўдакладняецца, і мы знаходзімся ў пастаянным супрацоўніцтве з Міністэрствам культуры, аблвыканкамам і іншымі зацікаўленымі ўстановамі. Прапрацоўваем выніковы варыянт гэтай канцэпцыі — вырашаецца, як будзе выглядаць Менка да 2026 ці 2030 года. Было дадзена даручэнне перагледзець магчымасць павышэння статусу гэтага помніка.



Чым ён цікавы? Новыя даныя паказалі: гарадзішча складаецца з двух селішчаў — вялікага і малога. Адным з вынікаў стала адкрыццё ўнутрывальных канструкцый, якія называюцца клеці. Было выяўлена некалькі іх радоў. Аб'ект узводзіўся прыкладна ў 998—999-я гады: тады ссеклі гэтыя дрэвы і паклалі ў падмурак вала. Драўляныя клеці маюць такую ж функцыю, як арматура ў жалезабетоне: умацоўваюць вал знутры, трымаюць. У 2024 годзе даследчыкаў чакалі адкрыцці. Устанавілі, што ніжнія рады маюць гакавую сістэму — з кручкамі. Выявілі цікавыя рэчы яшчэ дахрысціянскага перыяду, як, напрыклад, убітая ў дуб ніжняя сківіца дзіка (згадваем паданні пра свяшчэнныя дубовыя гаі, дзе прыносілі ахвяры Перуну). Даследчыкі лічаць, што ў збудаванні — ужо другаснае выкарыстанне, пасля хрысціянізацыі.








— Падобных рэчаў на тэрыторыі Усходняй Еўропы няма наогул — у такім выглядзе, у такой захаванасці. Толькі Менка, толькі нашы раскопкі, — адзначае Аляксей Міхайлавіч. — Паўстала пытанне аб іх кансервацыі.

Тэхналагічны ўніверсітэт распрацаваў методыку кансервацыі з мэтай далейшай музеефікацыі. Клеці дасталі, яны прайшлі працэс кансервацыі — каб дрэва не разбуралася мікраарганізмамі, грыбкамі. Ёсць прапанова на месцы вала стварыць будынак музея для далейшага экспанавання там гэтых і іншых археалагічных знаходак. У прыватнасці, зверху дубовых бярвенняў клаліся сасновыя лагі і клеці. Аказалася, што ніжнія драўляныя канструкцыі былі цудоўнай якасці, падгонка бярвення ішла вельмі шчыльная. Спецыялісты прапанавалі версію, што на ніжніх слаях магла працаваць запрошаная арцель, а верх, хутчэй за ўсё, узводзілі мясцовыя «ўмельцы» (якасць укладкі далёкая ад ідэалу). Зразумела, што такая канструкцыя доўга не прастаяла...

Аднак Менка ўжо дала шэраг цікавых знаходак. Напрыклад, кісцень з арнаментам мог належаць статуснаму дружынніку. Былі ключы, гандлёвыя пломбы. Там жа выявілі пахаванне. Раскоп, верагодна, знаходзіўся паблізу ад царквы — яе мяркуюць знайсці сёлета. На другім аб'екце гэтага ж комплексу былі знойдзены сякера, шпоры; гузік, пакрыты золатам (верагодна, належаў духоўнай асобе), а таксама імпартныя рэчы — рыльца грэчаскай амфары, донца з мальтыйскім крыжам...

Драўляныя канструкцыі цяпер знаходзяцца ў Гродне на рэстаўрацыі. Пасля раскопак у навукоўцаў амаль не застаецца сумневаў, што летапісны Мінск пачынаўся з пасялення на Менцы і пасля палітычных падзей 1067 года паселішча было перанесена на Нямігу.

Беларускія археолагі даследуюць таксама іншыя аб'екты, у прыватнасці Крэўскі замак. Удакладняюцца этапы яго будаўніцтва і знешні выгляд.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**



## Отчет эмитента ценных бумаг за январь – декабрь 2024 года

## ООО «Темпл Сити»

*220012, г. Минск, пр-т Независимости, 95/1, комн. 7, УНП 192280260.*
